Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
17 САКАВІКА 2018 г. СУБОТА № 52 (28668)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Рамашкі-падарожнікі, вегетарыянцы і веласіпедысты

СТАР. 5



Пластычная мова скульптара Слабодчыкава

СТАР. 8



Сям'я Коласа — аб захаванні спадчыны

СТАР. 9

# На сакавіцкім сонейку



Былы будаўнік Мінскага трактарнага завода, а цяпер — пенсіянер Віктар НЕБЫШЫНЕЦ, дзесяць гадоў таму вярнуўся на сваю малую радзіму — у вёску Навасёлкі Барысаўскага раёна, займаецца хатняй гаспадаркай, агародам, трымае свойскую жывёлу. І сябруе з хатнімі гадаванцамі *(адзін з іх — на гэтым фота)*, якія аддаюць Віктару Міхайлавічу сваю пяшчоту і цяпло.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля ХВІР, намеснік начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры:**

*«На нядаўняй калегіі Міністэрства культуры прынята рашэнне аб неабходнасці распрацоўкі падыходаў па стымуляванні ўдзелу фізічных і юрыдычных асоб у рэстаўрацыі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама захаванні аб'ектаў нематэрыяльнай спадчыны. Мы лічым, што мясцовыя органы ўлады, ведаючы сітуацыю знутры, могуць унесці прапановы, якім чынам прастымуляваць цікавасць уласнікаў аб'ектаў, што ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Магчыма, гэта могуць быць пэўныя фінансавыя паслабленні».*

■ З першых вуснаў

# З АРЫЕНЦІРАМ НА ПРАКТЫЧНЫ ВЫНІК



Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі даў эксклюзіўнае інтэрв'ю «Звяздзе». Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА — пра заканатворчасць, вясновую сесію і адказнасць парламента

**На пульсе праблем**

***— Адзін знакаміты чалавек некалі сказаў, што законы павінны адпавядаць уласцівасцям народа, толькі тады яны і працуюць. Уладзімір Паўлавіч, якім уласцівасцям беларускага народа, на вашу думку, адпавядае наша заканадаўства?***

— Па галоўнай сутнасці, я назваў бы імкненне да мірнага, спакойнага, годнага жыцця на роднай зямлі, сваім розумам і са сваіго мазаля, з апорай на нацыянальныя традыцыі і гістарычны вопыт, уменне ладзіць з людзьмі розных нацыянальнасцяў, праявіць добрую волю, дамаўляцца. Яшчэ адзначу рашучае непрыманне агрэсіі, насілля, любых беспарадкаў, дыскрэдытацыі дзяржавы і ўсяго, што наносіць ёй шкоду, здольнасць да разумных рашэнняў у складаных сітуацыях. Усё гэта адлюстроўвае нашы грамадскія каштоўнасці, факусіруецца ў дзяржаўнай палітыцы і знаходзіць увасабленне ў заканадаўчай базе, дзякуючы чаму Беларусь за няпросты час суверэнітэту і незалежнасці не адкацілася назад у развіцці, а на такім трывалым фундаменце паслядоўна рухаецца наперад. Дзейнасць Палаты прадстаўнікоў падпарадкавана менавіта гэтаму.

СТАР. 2

■ Класныя навіны

# ШЧЫРА — ПРА ШКОЛУ

Выпускнікі спадзяюцца на рэпетытараў, шанцаванне і добрае стаўленне настаўніка

**У старшай школе да паслуг рэпетытараў звярталіся 81,4 % навучэнцаў. Найбольш крытычна ацэньваюць дастатковасць сваіх ведаў для паступлення ў ВНУ, як ні дзіўна, навучэнцы гімназій (сярод іх колькасць незадаволеных складае 62 %). Увогуле доля тых, хто займаецца з рэпетытарам і незадаволены сваімі ведамі, істотна ўзрастае разам з сярэднім балам. Такім чынам распаўсюджаная думка аб тым, што выдаткі радзей звяртаюцца да дапамогі рэпетытараў, не знаходзіць свайго пацвярджэння. Гэту цікавую тэндэнцыю выявіла сацыялагічнае даследаванне «Вучаць у школе»: як, чаму і навошта?». Яго вынікі рэпрэзентавалі Даследчы цэнтр Інстытута прыватызацыі і менеджменту. Даследаваннем было ахоплена больш як тысяча маладых людзей ва ўзросце ад 17 да 21 года, якія скончылі ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі ў апошнія гады, а таксама эксперты. У якасці апошніх выступілі настаўнікі гарадскіх і сельскіх школ, гімназій, ліцэяў і прыватных школ, а таксама выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў.**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!
Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2018 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Гарант стваральнага развіцця краіны

*Паважаныя ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў, дарагія ветэраны!*

Віншую вас са 100-годдзем з дня ўтварэння ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

Войскі, сфарміраваныя як дзяржаўная ваенная арганізацыя, прызначаная для абароны грамадства і дзяржавы, заўсёды адказна і добрасумленна выконвалі свой воінскі абавязак, з'яўляючыся гарантам стваральнага развіцця краіны.

Сёння гэта зладжаны, высокамабільны ваенны арганізм, які вырашае ў мірны час унікальныя па спецыфіцы і складанасці службова-баявыя задачы. Асабовы склад надзейна стаіць на варце канстытуцыйнага ладу, уносячы свой уклад у захаванне спакою ў Рэспубліцы Беларусь.

Асаблівыя словы ўдзячнасці ветэранам за тое, што вы не страчваеце сувязь са сваімі падраздзяленнямі, таварышамі па баявым брацтве, займаецеся патрыятычным выхаваннем моладзі.

У гэты ўрачысты і радасны дзень сардэчна жадаю ўсяму асабоваму складу ўнутраных войскаў, вашым родным і блізкім моцнага здароўя, шчасця, новых здзяйсненняў у высакароднай справе служэння Айчыне!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# НЕ ЧАКАЦЬ ПАГРОЗУ, А ПРАДУХІЛЯЦЬ

**Напярэдадні 100-годдзя з дня стварэння ўнутраных войскаў МУС Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў вайсковую часць 5448 у Мінску. Кіраўнік дзяржавы вырашыў паглядзець, як арганізаваны побыт маладых байцоў, у якіх умовах ім даводзіцца служыць. Каб пераканацца ў тым, што сапраўды ўсё добра, беларускі лідар пайшоў не па запланаваным маршруце. Таму наведаў не толькі казарму, але і амаль усе памяшканні часці. Нават сталовую, дзе пакаштаваў, чым харчуюцца байцы — і застаўся цалкам задаволены.**

Прэзідэнт асобна адзначыў, што роля ўнутраных войскаў нават у мірны час — вялікая і супакойваючая. «Я гэта вельмі цаню, часта аб гэтым гавару і заўсёды настойваю на тым, каб ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў неслі службу, асабліва ў гарадах, у Мінску, дзе розных людзей хапае. І яшчэ важна: калі вы ідзяце па вуліцы і бачыце патруль, то сябе ўпэўнена і спакойна адчуваеце. Асабліва бацькі з маленькімі дзецьмі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах кіраўніка дзяржавы, гэта войскі, якія ў мірны час выконваюць функцыі па навядзенні ўнутранага парадку ў краіне, якія знаходзяцца практычна ў пастаяннай баявой гатоўнасці, як пагранічнікі, напрыклад. «Гэта вельмі пачэсная служба, — лічыць беларускі лідар. — Бацькі хочуць, каб сыны тут служылі, хоць ужо і дзяўчаты служаць. Яны сёння разам з міліцыяй забяспечваюць унутраную бяспеку нашай дзяржавы. Гэта яны наводзяць парадак, дапамагаюць і ўчастковым міліцыянерам, і следчым паставіць на месца злачынцаў».

Падчас наведвання вайсковай часці Прэзідэнт адказаў на пытанні журналістаў, якія датычыліся і іншых тэм. Так, кажучы пра асаблівасці сёлетняй пасяўной кампаніі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што залогам яе поспеху стане арганізаванасць і дысцыпліна, бо «ўсе астатнія пытанні вырашаны». Калі глеба будзе гатовая, варта пачынаць сеяць, рабіць гэта арганізавана. Увогуле на цяперашнім этапе пасяўная — гэта ўжо не тая кампанія, якая выклікае цяжкасці, як было раней. «Тады была патрэбная большая мабілізацыя людзей, не заўсёды хапала тэхнікі, угнаенняў, насення, грошай і гэтак далей. Сёння гэта ўсё ёсць. І той, хто своечасова думае аб пасяўной кампаніі, пасее нармальна», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Асобна беларускі лідар звярнуўся да тэмы перамог нашых параалімпійцаў, якія заваявалі ў Пхёнчхане ўжо дзесяць медалёў. Па яго словах, яны робяць цуды. Прычым кіраўнік дзяржавы даўно знаёмы з беларускімі параалімпійцамі, а з некаторымі сустракаўся не раз. «Яны, доказваючы, што такія ж, як і мы, здзяйсняюць подзвігі», — кажа Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт прызнаўся, што глядзіць трансляцыі з Параалімпіяды, калі ёсць магчымасць, а калі не — пераглядае запісы спаборніцтваў. «Я проста ўлюбіўся ў гэтых людзей. Гэта мужныя людзі, як яны змагаюцца! Калі б нашы спартсмены «без абмежаванняў» так выступалі, у нас было б па 30—40 медалёў», — выказаў думку кіраўнік дзяржавы.

«Скажаш ім (беларускім пераможцам-параалімпійцам. — **Зв.**) «дзякуй», а яны ў два разы лепш выступаюць. Вось такія людзі... Я шчаслівы, што мне ўдалося нарэшце акунуцца ў спаборніцкі рэжым гэтых людзей і сапраўды ацаніць іх па заслугах. Яны такія малайцы! — адзначыў Прэзідэнт. — Шчыра кажучы, чакаю, калі яны вернуцца ў краіну, каб ім падзякаваць, адпаведна ўзнагародзіць і заплаціць за іх неймаверную працу. Яны не проста героі — дзесяць медалёў! Гэта незвычайныя людзі».

Такой вытрымкі і мужнасці, як у іх, не хапае ўсім беларускім атлетам, лічыць беларускі лідар. Параалімпійцы не скардзяцца, што ім зашмат гадоў — трыццаць або пад сорак, а бяруць вінтоўку — і страляюць трапна, бяруць палкі ў рукі — і перамагаюць. «Цудоўная каманда, якая нечакана для мяне так выдатна выступае», — па заслугах ацаніў спартсменаў Аляксандр Лукашэнка.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# З АРЫЕНЦІРАМ НА ПРАКТЫЧНЫ ВЫНІК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— У сваіх каментарыях да заканатворчай работы парламента вы акцэнтуеце яе накіраванасць на прыняцце ўсебакова прапрацаваных, якасных і своечасовых рашэнняў. Аднак наколькі магчыма забяспечыць своечасовасць, калі ад распрацоўкі законапраекта і да яго прыняцця Палатай прадстаўнікоў праходзіць звычайна даволі працяглы час?***

— Проста трэба працаваць на апераджэнне.

***— У якім напрамку?***

— Адчуваючы пульс праблем, у цесным супрацоўніцтве з іншымі дзяржаўнымі органамі, спецыялістамі-практыкамі, экспертамі і грамадскасцю добра прагназаваць тэндэнцыі ў розных сферах грамадскага жыцця, асабліва ў эканоміцы, соцыуме, забеспячэнні нацыянальнай і грамадскай бяспекі, і прымаць адэкватныя рашэнні. Праца скажу вам, клопатная, комплексная, разнастайная па форме, але вынік яе вельмі значны для таго, каб прававыя механізмы развіваліся ў адпаведнасці з задачамі і мэтамі, якія стаяць перад нашай краінай.

## Праз шырокі дыялог

***— Заўважана, што ў цяперашнім дэпутацкім скліканні Палаты прадстаўнікоў праводзіцца больш, чым раней, круглых сталоў, семінараў, выязных пасяджэнняў пастаянных камісій і іншых мерапрыемстваў.***

— Гэта робіцца ў кантэксце таго, пра што я сказаў. Пры распрацоўцы і ўдасканальванні нормаў права мы абавязкова абапіраемся на грамадскую думку і экспертнае асяроддзе, бо чым эфектыўней працуюць парламентарыі, тым лепш для дзяржаўнай палітыкі. Хачу падкрэсліць, што для нас важна не толькі ведаць, як у грамадстве рэагуюць на законы і новыя заканадаўчыя ініцыятывы шырокага гучання, але і самім аператыўна інфармаваць людзей аб рабоце Палаты прадстаўнікоў. Прычым грамадскую думку на законы і нашы парламенцкія акцыі мы хочам ведаць пастаянна, у рэжыме анлайн. Таму актыўна развіваем механізм кансультацый з грамадскасцю і сур'ёзны прафесіянальны дыялог. Прыгаданыя вамі і іншыя мерапрыемствы дапамагаюць вызначыць прабелы ў нарматыўна-прававой базе, зняць супярэчнасці, пазбавіцца ад празмернай зарэгуляванасці некаторых пытанняў і знаходзіць такія заканадаўчыя рашэнні, якія адпавядаюць інтарэсам грамадства і дзяржавы.

***— Парламент — гэта пляцоўка для дыскусій ці для дыялогу? Як вы мяркуеце?***

— Я лічу, што парламент — гэта шырокі дыялог, сур'ёзная аналітыка, ініцыятыва і ўзважаныя рашэнні. Дыялог без дыскусіі не абыходзіцца, бо як дэпутаты, так і эксперты па шэрагу пытанняў маюць розныя пункты гледжання. Але дыскусіі абавязкова павінны быць канкрэтныя, а не абстрактныя, і завяршацца прыняццем рашэння, каб яны не былі пустым марнаваннем часу. Прынятыя Палатай прадстаўнікоў базавыя законы з'яўляюцца, як правіла, вынікам прадметных дыскусій, кампрамісу і пошуку збалансаваных рашэнняў усімі ўдзельнікамі заканатворчага працэсу. Нам вельмі дапамагае ўдасканальваць нашу заканатворчую дзейнасць зваротная сувязь з выбарчымі акругамі, дзе ў многім фарміруецца пазіцыя дэпутатаў па прававых навацыях.

***— Скажыце па сваім багатым дэпутацкім вопыце, з рэгіянальнага, так сказаць, пункту гледжання, што абавязкова павінна быць у законах?***

— Дакладнасць, яснасць і рэалістычнасць прававых мер. Гэта правіла нашай заканатворчай работы.

## У рэчышчы ключавых задач

***— Уладзімір Паўлавіч, не за гарамі вясновая сесія парламента. Напэўна, давядзецца замяніць цэлыя заканадаўчыя пласты ў кантэксце дэкрэтаў кіраўніка дзяржавы аб развіцці прадпрымальніцтва, лічбавай эканоміцы і працаўладкаванні?***

— Мы павінны так удасканальваць заканадаўства эканамічнага характару, каб выйсці на сістэмныя рашэнні ў рэчышчы ключавых задач росту эканомікі. Так што наперадзе ў нас вельмі напружаная работа. Самае галоўнае, каб яна спрыяла рэальным дынамічным зрухам ва ўсім эканамічным вымярэнні грамадскіх працэсаў. У прыкладной праграме чацвёртай сесіі — абмеркаванне Дэкрэта Прэзідэнта № 1 і Дэкрэта № 8, пытанні дзяржаўна-прыватнага партнёрства, дзяржаўных закупак тавараў (работ, паслуг), транспартна-экспедыцыйнай і дарожнай дзейнасці, пітнога водазабеспячэння, рэгулявання жыллёвых адносін, папраўкі ў Банкаўскі кодэкс, Кодэкс аб адміністрацыйных парушэннях і іншыя. Да першага чытання падрыхтаваны праект зусім новага Закона «Аб вытворчасці і абарачэнні арганічнай прадукцыі». Так што эканамічная тэматыка будзе разнастайная і даволі насычаная, як і ўвогуле заканатворчая работа на сесіі.

***— Як бы вы канцэнтравана акрэслілі заканатворчыя задачы вясновай сесіі?***

— У нас ёсць задача, якая не губляе сваёй актуальнасці — ствараць максімальна спрыяльныя заканадаўчыя ўмовы для забеспячэння ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця і надзейнай бяспекі краіны. На гэтай сесіі трэба будзе ўрэгуляваць важныя пытанні, звязаныя са стварэннем аптымальнага прававога суправаджэння дзелавой актыўнасці, стымулявання працоўнай занятасці, рэалізацыі сацыяльнай палітыкі, з нацыянальнай бяспекай і міжнародным супрацоўніцтвам. Адзначу карэкціроўку законаў сацыяльнай накіраванасці, якія датычацца абароны правоў спажыўцоў, якасці і бяспекі харчовых прадуктаў, базавы сістэмны законапраект аб нарматыўна-прававых актах і запатрабаваныя жыццём папраўкі ў базавы закон аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь.

## Па вострых кропках

***— У часткі грамадства яшчэ жывучыя папуліцкія чаканні ад парламента. Як «змагацца» з імі?***

— Вельмі проста — не трэба іх падагравацъ, бо ад такіх настрояў зыходзіць толькі адно: нежаданне нешта самому мяняць у сваім жыцці, дзейнічаць. Разам з тым, падкрэсліваю, нельга блытаць з гэтымі настроямі пазітыўныя чаканні людзей на перамены да лепшага ў вырашэнні грамадска значных сацыяльна-эканамічных праблем. Я не сумняваюся ў тым, што ўсе дэпутаты, якія прыйшлі ў Палату прадстаўнікоў менавіта з жаданнем паспрыяць хутчэйшым пераменам па тых кропках грамадскага жыцця, якія людзі ўспрымаюць асабліва востра. Упэўнены, абсалютная большасць дэпутатаў хоча зберагчы нашу Беларусь ад любых узрушэнняў і працуе дзеля гэтага, выкарыстоўваючы нашы рабочыя парламенцкія алгарытмы і традыцыі.

***— На вашу думку, якая роля парламента ў сучасных умовах больш важная — заканадаўчая або прадстаўнічая?***

— Не бачу тут альтэрнатывы. Гэта непарыўныя функцыі Палаты прадстаўнікоў. Яны дапаўняюць адна адну і па-сапраўднаму эфектыўнымі могуць быць толькі ў такім «тэндэме». Ён дае магчымасць адэкватна рэагаваць на розныя актуаліі і выклікі, з якімі мы сутыкаемся ў сваёй парламенцкай рабоце. Дзейсны прававы механізм ствараецца толькі пры рэалізацыі канкрэтных грамадскіх інтарэсаў — мясцовых, рэгіянальных, рэспубліканскіх. Многія дэпутаты працавалі раней кіраўнікамі рэгіёнаў, прадпрыемстваў і ўстаноў, тонка адчуваюць патрэбы людзей на месцах, ведаюць, як заканадаўчыя навацыі ўплываюць на жыццё простага чалавека. На першы план дэпутацкай работы ў выбарчых акругах мы паставілі практычнае вырашэнне праблем і задач, важных для людзей і тэрыторый, чым займаемся разам з выканаўчымі і распарадчымі органамі.

## Вектар у будучыню

***— Парламенцкае жыццё складаецца не толькі з заканатворчай і прадстаўнічай работы. Значнае месца ў ёй займае міжнароднае супрацоўніцтва. Нядаўна беларуская парламенцкая дэлегацыя на чале з вамі пабывала з першым афіцыйным візітам у Швейцарыі. Пра падпісаныя там важныя пагадненні і пазітыўныя вынікі візіту ўжо расказвалася ў СМІ. Уладзімір Паўлавіч, як вы лічыце, ці можна сказаць, што міжпарламенцкія ўзаемадносіны з еўрапейскімі партнёрамі выходзяць на новы ўзровень?***

— Пасля мінулагодняй летняй сесіі АБСЕ, якая адбылася ў Мінску, у Заходняй Еўропе пакрысе адбываецца адмова ад стэрэатыпаў у стаўленні да Беларусі. Мы ўзаемна робім яшчэ першыя, але рэальныя крокі да наладжвання сталага ўзаемадзеяння, у тым ліку і па міжпарламенцкай лініі. Хацелася б, каб вектар развіцця беларуска-еўрапейскіх адносін у цэлым быў накіраваны ў будучыню, найперш да новых гарызонтаў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Маю на ўвазе інвестыцыі ў нашу эканоміку, сумесную рэалізацыю высокатэхналагічных, вытворчых і іншых праектаў. Наша парламенцкая дыпламатыя працуе на гэтыя і іншыя важныя для краіны тэмы. Менавіта ў такім ключы развіваецца траекторыя міжпарламенцкіх кантактаў Нацыянальнага сходу, якія з'яўляюцца часткай беларуска-еўрапейскага партнёрства. У Швейцарыі мы ўбачылі, што цікавасць да нашай краіны, да ўзаемаразумення і развіцця супрацоўніцтва ёсць. Прычым канкрэтная і дзелавая.

***— 18 сакавіка адбудуцца выбары Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі. Якія вашы чаканні ад іх вынікаў?***

— Каб усе дзеянні братняй нам Расіі ў адносінах да Беларусі ў фармаце Саюзнай дзяржавы і ў Еўразійскім эканамічным саюзе былі нацэлены на ўмацаванне дасягнутага ва ўзаемавыгадным супрацоўніцтве, на практычную аддачу, абарону нашых агульных інтарэсаў і аб'яднанне намаганняў у супрацьдзеянні сучасным выклікам міраму, абароненаму жыццю расійскага і беларускага народаў. Каб ні ў чым не зніжалася дасягнутая вышыня.

***— Цікава, Уладзімір Паўлавіч, якой вам бачыцца Беларусь у аглядной перспектыве?***

— Моцнай эканамічна, сацыяльна развітой і камфортнай для жыцця кожнага чалавека. Нягледзячы на сённяшнія цяжкасці і праблемы, гэта дзяржаўная мэта не мае патрэбы ў рэвізіі.

**Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.**

■ Ад ідэі да распрацоўкі

# «Нябесны транспарт» на струнах

**Надземнае метро можа з'явіцца ў Беларусі ўжо ў наступным годзе. Размова ідзе пра эстакадны транспарт, утульныя вагончыкі якога рухаюцца па папярэдне нацягнутых струнах з дапамогай матор-кола. Ідэя і распрацоўка струннага транспарту SkyWay (скайвэй) належыць айчыннаму навукоўцу, інжынеру і вынаходніку Анатолю Юніцкаму, які ўпершыню «абкатаў» яе на стаметровай трасе ў маскоўскім парку «Каломенскае».**

Цяпер тры эксперыментальныя трасы ўстаноўлены ў цэнтры дэманстрацыі і сертыфікацыі SkyWay «ЭкаТэхнаПарк» на тэрыторыі былога ваеннага палігона ў Пухавіцкім раёне, знаёміцца з імі прыязджаюць транспартнікі з усяго свету.

Плануецца, што ўжо ў наступным годзе будаўніцтва струннай лініі пачнецца ў Магілёве, яна звяжа два берагі Дняпра — вуліцу Арджанікідзэ і мікраёран Фаціна. Пасля пуску дарога са спальнага раёна ў цэнтр горада зойме некалькі хвілін, бо вагоны ў стане развіваць хуткасць да 150 кіламетраў у гадзіну. Яшчэ і таму, што ніхто ім не замінае — ні заторы на трасе, ні калдобіны ці пешаходы. На перспектыву запланаваны яшчэ дзве такія лініі ў абласным цэнтры.

Папулярызацыю праекта вядзе адукацыйны цэнтр БелТРАНСНЕТ, дзе і адбылася прэзентацыя навінкі, якая абяцае сапраўдную рэвалюцыю ў гарадскім асяроддзі жыхарства. Ды і не толькі ў гарадскім. **Кіраўнік мінскага рэгіянальнага цэнтра БелТРАНСНЕТ Мар'ян ГАШТОЛЬД** расказаў журналісту «Звязды», што новы від транспарту прыдатны і для арганізацыі прыгарадных (горад-аэрапорт) і міжгародніх зносін — паміж населенымі пунктамі, размешчанымі адзін ад другога на адлегласці 300 і больш кіламетраў.

Важна, што сабекошт перавозак у два разы ніжэйшы, чым у метро, і ў тры разы — чым у трамвая.

**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ**

■ Фінансы

## БОЛЬШ ЗА 1 МЛРД USD З-ЗА МЯЖЫ

**Насельніцтва нашай краіны летась атрымала 1,055 млрд долараў асабістых пераводаў з-за мяжы, што на 21,8 % больш у параўнанні з 2016 годам, паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка.**

Чыстая аплата працы (мінус выплачаныя падаходныя падаткі) склала 420,9 млн долараў, павялічыўшыся ў параўнанні з папярэднім годам на 28,3 %. Дадаткова грашовыя пераводы работнікаў склалі 526,8 млн долараў, павялічыўшыся, у параўнанні з годам мінулым, на 15,2 %. За мяжу летась беларусамі адпраўлена 116,7 млн долараў асабістых пераводаў, або на 5 % больш у параўнанні з 2016 годам.

Як растлумачылі ў Нацбанку, асабістыя пераводы вызначаюцца як сума бягучых і капітальных трансфертаў у грашовай або натуральнай форме паміж хатнімі гаспадаркамі-рэзідэнтамі і хатнімі гаспадаркамі-нерэзідэнтамі, плюс аплата працы работнікаў (без уліку падаткаў і адлічэнняў на сацыяльныя патрэбы, выплачаных у краіне найму), мінус выдаткі на транспарт і паездкі, звязаныя з працай за мяжой. Іншымі словамі, асабістыя пераводы ўключаюць усе трансферты паміж хатнімі гаспадаркамі і чыстую аплату працы работнікаў-нерэзідэнтаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «Можна сказаць, што «Звязда» нас зблізжае»

**Людміла Мікалаеўна СТОКА з Гродна выпісвае «Звязду» вось ужо 25 гадоў. Газету чытаюць усе члены сям'і, у тым ліку муж і дзеці жанчыны. Цікавіцца падзеямі і 93-гадовая маці Людмілы Мікалаеўны.**

— Мая матуля часта просіць пачытаць ёй «Звязду». Ёй вельмі падабаецца, што газета на беларускай мове, бо гэта ж наша мова. Мы таксама зрабілі свой выбар, дзякуючы мове. Я з дзяцінства яе чула вакол сябе, вучылася ў беларускай школе ў вёсцы Гудзевічы Мастоўскага раёна. Мая дачка хоць і не паўсюдна карыстаецца мовай, але выбрала яе пры здачы экзамену ў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт.

«Звязду» чытаем ад першай да апошняй старонкі. Асабліва радуе, што яна выходзіць амаль штодзённа і ў паштовай скрыні кожны дзень — свежы нумар. Таму можна сказаць, што мы не расстаёмся са «Звяздой» ні на хвіліну. У кожным нумары знаходзім нямала цікавага і карыснага. Я, напрыклад, займаюся садам і агародам, знаходжу для сябе нямала добрых парад, абавязкова прачытаю матэрыялы на тэму здароўя. Люблю чытаць «Алё, народ на провадзе». Матулі сваёй чытаю артыкулы пра розныя падзеі, нейкія сенсацыі. А яшчэ яна вельмі цікавіцца вясковымі падзеямі, не прапускаем матэрыялы пра вясковае жыццё, пра вёскі, якія знікаюць. Нядаўна чыталі аб нашых родных Гудзевічах і быццам зноў там пабывалі. Вельмі радуе, што вёска жыве, развіваецца, людзі працуюць у мясцовай гаспадарцы. Будзем і далей чакаць матэрыялаў аб вясковым жыцці. На газету абавязкова падпішамся на новы квартал, бо яна стала нам неабходнай. Не ўяўляю, як гэта — не ўбачыць у паштовай скрыні свежы нумар. Ды і матуля чакае, каб ёй пачыталі «Звязду». Можна сказаць, што газета нас нават зблізжае...

■ Весткі з Кітая

# Янка Купала ў Кітай ідзе!..

У выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» пабачыла свет кніга «А хто там ідзе?»: на мовах свету», дзе пад адной вокладкай сабраны тэксты легендарнага верша беларускага песняра, створанага ў 1905—1907 гадах, на 101 мове народаў свету.

На кітайскую мову пададзены тэкст у перакладзе Чжу Цзі. Варта зазначыць, што кітайскі чытач даўно знаёмы з паэзіяй Янкі Купалы. Яшчэ ў 1953 годзе выйшла асобным выданнем «Жалейка» на кітайскай мове. Вобраз Янкі Купалы стаў і падставай для мастацкіх росшукаў кітайскіх каліграфаў. У кнізе «А хто там ідзе?»: на мовах свету» змешчаны рэпрадукцыі партрэтаў народнага песняра Беларусі, выкананыя Ао Тэ і Гаа Манам. Такая ўвага дарагога каштуе.

У цэнтры культуры Беларусі ў Другім Пекінскім дзяржаўным універсітэце замежных моў ёсць кнігі, фотаздымкі Янкі Купалы. Будзем спадзявацца і на ўвагу новага пакалення кітайскіх перакладчыкаў у дачыненні да перастварэння неўміручых твораў класіка беларускай паэзіі.

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**

# ЧЫТАННЕ ДЛЯ ДУШЫ

## Дзень праваслаўнай кнігі адзначылі ў Беларусі

**Урачыстае мерапрыемства адбылося 15 сакавіка ў Духоўна-адукацыйным цэнтры Беларускай праваслаўнай царквы ў Мінску. Свята традыцыйна прымеркавана да даты выдання 14 сакавіка 1564 года друкарамі Іванам Фёдаравым і Пятром Мсціслаўцам «Апостала».**

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Выдавецкі савет Беларускай праваслаўнай царквы, Мінская духоўная акадэмія, Свята-Елісавецінскі манастыр, Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі Беларусі. Сярод гасцей свята — кіраўнікі мясцовых выканаўчых органаў, прадстаўнікі дыпламатычных місій, супрацоўнікі міністэрстваў культуры, інфармацыі і адукацыі Беларусі, рэктары, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў. Узначаліў мерапрыемства Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. «Мы сёння ўспамінаем нашых асветнікаў — свяціцеля Кірылу Тураўскага, прападобную Еўфрасінню Полацкую, першадрукара Францыска Скарыну, памятаем пра друкара Івана Фёдарава. Калі мы кожны дзень трымаем у руках кнігу, яна не выклікае ў нас здзіўлення. А раней, калі людзі ўпершыню ўбачылі надрукаваную кнігу, — гэта было амаль цудам. Аказваецца з яе дапамогай можна вялікай колькасці людзей знаёміцца з гісторыяй, асветай. І мы сёння радуемся, што Гасподзь даў магчымасць на нашай беларускай зямлі расці, працаваць і даваць плён тым асветнікам, якія я назваў», — сказаў мітрапаліт.

Асноўная мэта арганізатараў свята — выклікаць цікавасць да духоўнай літаратуры, прывіць малодшаму пакаленню любоў да чытання і адзначыць асаблівую ролю духоўных кніг у выхаванні чалавека.

Афіцыйна Дзень праваслаўнай кнігі адзначаецца ў Беларусі з 2009 года. Сёлета падзея звязана з 220-годдзем з дня нараджэння мітрапаліта Літоўскага і Віленскага Іосіфа (Сямашкі), праца якога спрыяла развіццю беларускай культуры і нацыянальнай самасвядомасці.

У гонар свята бібліятэка Мінскай духоўнай акадэміі да 23 сакавіка запрашае на бясплатную выстаўку рукапісных і факсімільных выданняў біблейскіх тэкстаў. Мерапрыемствы да Дня праваслаўнай кнігі адбываюцца ва ўсіх епархіях Беларускага Экзархата.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## САУДАЎСКАЯ АРАВІЯ ПЕРАВЯЛА Ў ЦЭНТРАБАНК ЕМЕНА $2 МЛРД



Аб гэтым паведаміла саудаўскае інфармацыйнае агенцтва SPA. Пагадненне аб дэпазіце падпісалі ў Рыядзе саудаўскі міністр фінансаў Махамед Аль-Джаадан і кіраўнік ЦБ Емена Махамед бін Мансур Замам. У ходзе цырымоніі падпісання Аль-Джаадан адзначыў, што пагадненне адлюстроўвае палітыку каралеўства па падтрымцы «еменскага народа». На думку міністра, новы ўклад палепшыць фінансавую сітуацыю ў Емене і пазітыўна адаб'ецца на ўмовах жыцця яе грамадзян.

## ПАРЛАМЕНТ ПЕРУ ПАДТРЫМАЎ ІНІЦЫЯТЫВУ АБ ЗАПУСКУ ПРАЦЭСУ ІМПІЧМЕНТУ ПРЭЗІДЭНТА

Кангрэс Перу (аднапалатны парламент) прыняў да разгляду праект рэзалюцыі аб адхіленні ад пасады прэзідэнта краіны Пэдра Пабла Кучынскі ў сувязі з «маральнай нягодльнасцю» займаць гэтую пасаду. Адпаведнае рашэнне было прынята на пасяджэнні, якое трансляваў на сваім сайце тэлеканал TV Peru. За запуск працэсу імпічменту кіраўніка дзяржавы прагаласавалі 87 дэпутатаў са 117 прысутных. Гаворка ідзе пра ўжо другую спробу адправіць Кучынскі ў адстаўку, якая робіцца за апошнія тры месяцы. Ініцыятыва аб адстаўцы звязана з карупцыйным скандалам вакол бразільскай будаўнічай карпарацыі Odebrecht. У канцы мінулага года стала вядома, што ў перыяд з 2004-га да 2013 года гэтая кампанія пераявла фірмам, звязаным з дзеючым прэзідэнтам, каля $4,8 млн у якасці ўзнагароджання за «кансультацыйныя паслугі». Акрамя таго, былы топменеджар Odebrecht Жоржы Барат на допыце заявіў, што фінансаваў выбарчую кампанію Кучынскі. Кіраўнік дзяржавы неаднаразова адмаўляў факт атрымання грошай ад бразільскай кампаніі, таму зараз апаненты абвінавачваюць яго ў хлусні.

## УРАД ЯПОНІІ ВЫРАШЫЎ ПАДТРЫМАЦЬ ПРАЕКТЫ СТВАРЭННЯ ЛЯТУЧЫХ АЎТАМАБІЛЯЎ



Урад Японіі прыняў рашэнне актыўна падтрымаць распрацоўку ў краіне лятучых аўтамабіляў з мэтай вырашэння праблемы транспартных затораў і аптымізацыі грузавых патокаў. Як паведаміў тэлеканал NHK, міністэрства эканомікі, гандлю і прамысловасці краіны мае намер прыступіць да падрыхтоўкі адпаведнага заканадаўства і аказаць дапамогу кампаніям, якія займаюцца такой тэхнікай. Ведамства разглядае стварэнне лятучых аўтамабіляў як патэнцыйна адну з самых перспектыўных галін развіцця нацыянальнай індустрыі. Мяркуецца, у прыватнасці, сфарміраваць пры міністэрстве савет экспертаў, які павінен заняцца каардынацыяй работы па распрацоўцы такіх прылад, абмеркаваннем прапанаваных тэхналогій. Спробы стварэння лятучых аўтамабіляў робіцца цяпер у розных краінах. У Японіі прыкметная актыўнасць кампаніі Cartivator з удзелам аўтамабілебудаўнічага гіганта Toyota Motor і іншых буйных карпарацый. Яна, у прыватнасці, мае намер стварыць прататып лятаючага аўтамабіля да маючай адбыцца ў Токіа летняй Алімпіяды 2020 года.

## ЦАЦАЧНАЯ ІМПЕРЫЯ ПРАЙГРАЛА ГАДЖЭТАМ

Кампанія Toys «R» Us, уладальнік найбуйнейшай у ЗША сеткі крамаў цацак, паведаміла супрацоўнікам аб ліквідацыі ўсіх сваіх амерыканскіх гандлёвых пунктаў — іх больш за 700. Аб гэтым паведаміў Euronews. Што датычыцца крамаў у Азіі і Канадзе, кампанія збіраецца правесці іх рэарганізацыю і паспрабаваць знайсці пакупнікоў на актывы, гэтак жа як у Аўстраліі, Іспаніі, Германіі, Францыі і Польшчы. У найбліжэйшыя тыдні закрыюць свае дзверы гандлёвыя пункты ў Вялікабрытаніі. Усяго ў свеце налічваецца амаль 1600 крамаў Toys «R» Us, у якіх працуюць 65 тысяч супрацоўнікаў. Кампанія з 70-гадовай гісторыяй сутыкнулася з сур'ёзнымі фінансавымі праблемамі, аказаўшыся не ў стане канкураваць на інтэрнэт-рынку з такімі сеткамі, як Amazon і Walmart, а таксама ростам папулярнасці сярод дзяцей гаджэтаў і камп'ютарных гульняў у процівагу звычайным цацкам.

**Аднакурснікі, выпускнікі Віцебскай ветэрынарнай акадэміі 1977 года, глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю былога старасты курса КАЛІШЧУКА Яўгена Міхайлавіча і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

# ШЧЫРА — ПРА ШКОЛУ

## Калі не хапае ведаў...

Даследчыкі звярнулі ўвагу на наступную супярэчнасць: з аднаго боку, змест уступных экзаменаў цалкам адпавядае школьнай праграме, а з іншага — навучэнцы не спадзяюцца на школьныя веды і спрабуюць павысіць свае шанцы на паступленне, звяртаючыся да паслуг рэпетытараў. На думку экспертаў, гэта можа быць сведчаннем агульнай неэфектыўнасці навучальнага працэсу, выкліканай самымі рознымі фактарамі: асобаснымі характарыстыкамі вучняў ці настаўнікаў, асаблівасцямі арганізацыі навучання і іншымі. Многія з іх адзначаюць, што па дзеючых нормах асноўная вучэбная нагрузка павінна прыпадаць на школьныя ўрокі. Аднак у класах, дзе вучыцца адначасова як мінімум 20 чалавек, за час урока можна выдзеліць для кожнага вучня па дзве хвіліны ў найлепшым выпадку. Такім чынам атрымліваецца, што для кагосьці ўрок ідзе занадта хутка і аб'ём інфармацыі, якую трэба засвоіць, — празмерна вялікі, а для кагосьці наадварот — занадта павольна.

Увогуле вучэбная нагрузка складаецца з некалькіх кампанентаў: непасрэдна на ўроках, пры выкананні дамашніх заданняў, а таксама пры падрыхтоўцы да іспытаў. Тэарэтычна нагрузка пры падрыхтоўцы да экзаменаў у ВНУ/ССНУ не павінна вылучацца ў асобную катэгорыю, аднак эксперты адзначаюць, што ў рэальнасці вучням даводзіцца папаўняць і адналюляць веды па тых прадметах, якія яны выбралі ў якасці экзаменацыйных, і робяць яны гэта, як правіла, дадаткова. Ва ўсіх трох выпадках большасць рэспандэнтаў паведаміла, што лічаць нагрузку аптымальнай. Аднак варта звярнуць увагу на тое, што больш за чвэрць апытаных ацэньваюць яе як недастатковую пры падрыхтоўцы да іспытаў і адначасова з гэтым пятая частка рэспандэнтаў лічыць нагрузку пры выкананні дамашніх заданняў празмернай.

**Крайнюю ступень важнасці адзнак для сябе адзначаюць амаль 16 % рэспандэнтаў. Яны ўпэўнены, што ад іх залежыць будучыня!**

Крыху больш за 21 % рэспандэнтаў выдаткоўваюць на выкананне дамашніх заданняў менш за гадзіну, 44 % — ад гадзіны да дзвюх, 27 % — ад дзвюх да трох гадзін і 8 % — больш за тры гадзіны ў дзень. Гэта значыць, што рэальная нагрузка не перавышае патрабаванні Міністэрства аховы здароўя, але, на думку экспертаў, яна не дае таго аб'ёму ведаў і навыкаў, што патрабуецца для эфектыўнага працягу навучання і выхаду на рынак працы.

Рэспандэнты з нізкімі адзнакамі выдаткоўваюць на дамашняе заданне значна менш часу, чым астатнія. Ва ўсіх групах, акрамя групы з нездавальняючымі ацэнкамі, большая частка апытаных траціць на іх ад гадзіны да дзвюх. Але **чым вышэйшы ў навучэнца бал — тым больш часу ён адводзіць на дамашнюю работу.**

Сярод прычын, па якіх навучэнцы звяртаюцца да рэпетытараў, фігуруюць наступныя: «не разумеў некаторыя школьныя прадметы і даводзілася разбірацца дадаткова», «хацеў ведаць прадмет лепш — не хапала ведаў, якія давалі ў школе», «неабходнасць да паступлення ў ВНУ/ССНУ, таму што ў школе ўзровень падрыхтоўкі быў слабы», «неабходнасць падрыхтавацца да паступлення ў ВНУ/ССНУ, таму што да апошняга класа паспеў усё забыць», «настаялі бацькі». І тут зноў прасочваецца тая ж тэндэнцыя: **недахоп ведаў і жаданне ведаць прадмет глыбей часцей за ўсё згадваюць навучэнцы з высокім сярэднім балам.**



39,5 % рэспандэнтаў прызналіся, што школьных ведаў для паступлення ў ВНУ ім аказалася недастаткова, яшчэ **10 % паведамілі, што іх зусім не дастаткова.**

## Не кантраляваць, а натхняць!

Настаўнікі, якія прымалі ўдзел у апытанні, адзначылі, што апошнім часам уцягнутасць бацькоў у адукацыйны працэс значна ўзрасла. Некаторыя лічаць гэта вынікам інфарматызацыі, паколькі з'явілася магчымасць больш актыўна кантактаваць з педагогамі ў сацыяльных сетках і месенджарах. Але эксперты па-рознаму ацэньваюць цяперашнія магчымасці. З аднаго боку, бацькі могуць своечасова атрымліваць інфармацыю аб актуальных праблемах, звязаных з навучаннем іх дзяцей, а з іншага — некаторыя настаўнікі ўжо скардзяцца на празмерную актыўнасць некаторых з іх.

Даследчыкі паспрабавалі ўстанавіць залежнасць паміж уцягнутасцю бацькоў у адукацыйны працэс і яго вынікамі. Па-першае, важна было высветліць меркаванне рэспандэнтаў пра тое, ці павінны бацькі ў прынцыпе дапамагаць сваім дзецям з выкананнем дамашніх заданняў. Большасць апытаных (64 %) лічаць, што павінны, калі дзеці іх аб гэтым папросяць. Пятая частка адказала, што для таго ёсць настаўнікі. А 15 % апытаных заявілі, што бацькі абавязаны гэта рабіць. Аднак вынікі апытання сведчаць, што ў большасці выпадкаў бацькі не часта дапамагаюць дзецям з выкананнем заданняў: больш чым у палову рэспандэнтаў яны правяраліся рэдка ці вельмі рэдка. Настаўнікі ў інтэрв'ю адзначылі, што некаторыя бацькі лічаць кантроль найважнейшай матывацыяй для дзяцей. Аднак, на думку педагогаў, кантроль у некаторых выпадках адбіваецца негатыўна на зацікаўленасці дзяцей у атрыманні адукацыі, **а пастаянная «апека» не дазваляе вучням адчуць поўную меру адказнасці за ўласнае навучанне.**

Нягледзячы на ўмераную ступень уцягнутасці бацькоў у адукацыйныя працэсы, канфлікты з-за адзнак з імі ўзнікалі ў 72 % рэспандэнтаў. У 14 % удзельнікаў апытання такія канфлікты адбываліся часта або вельмі часта. **Даследаванне ўстанавіла, што і выдатнікаў, і «двоечнікаў» караюць за ацэнкі з аднолькавай перыядычнасцю.** І, як і ў выпадку з кантролем, гэта не аказвае значнага ўплыву на паспяховасць.

Большасць экспертаў сыходзяцца на думцы, што бацькі павінны прымаць удзел у працэсе адукацыі дзяцей, але не ў якасці кантралёра або карнага органа (і кантролем, і санкцыямі займаецца школа), а ў якасці памочнікаў у выпадку неабходнасці, а таксама ў якасці натхняльнікаў. Вядома, зацікавіць вучня павінен найперш настаўнік, але эксперты мяркуюць, што ў гэтым выпадку першапачатковы ўнёсак маці і бацькі таксама можа адыграць значную ролю ў фарміраванні цікавасці да вучобы ў цэлым.

## Адзнакі — для прыгожай статыстыкі?

Адной з задач даследавання было вызначыць стаўленне да дзеючай сістэмы ацэньвання як педагогаў, так і вучняў. У якасці асноўнай праблемы настаўнікі назвалі патрабаванне пастаяннага павышэння сярэдняга бала па класе і школе ў цэлым. Яны вымушаны рэгулярна праводзіць падлік сярэдніх балаў і адпраўляць адпаведныя звесткі ў кіруючыя органы.

Яшчэ адна «спецыфічная асаблівасць» — настаўнік не можа паставіць усяму класу аднолькава высокія або нізкія адзнакі, бо, як правіла, узровень вучняў адрозніваецца. Таму моцныя параўноўваюцца са слабымі, і менавіта па такім прынцыпе ўсім навучэнцам у класе выстаўляюцца адзнакі. Здараецца, што педагог параўноўвае бягучыя поспехі аднаго вучня з яго папярэднімі поспехамі і ў залежнасці ад гэтага выстаўляе яму вышэйшы або ніжэйшы бал. Таму адна і тая ж адзнака (лічба) можа стаяць у атэстаце двух вельмі розных па ўзроўні падрыхтоўкі вучняў.

Таксама эксперты адзначалі, што існуюць некаторыя складанасці пры выстаўленні адных і тых жа балаў за розныя віды работы. Напрыклад, 9 балаў за выкананне кантрольнай і 9 балаў за працу каля дошкі — гэта зусім розныя па змесце, але роўныя па значэнні адзнакі. Ацэньванне работы з новым матэрыялам і з ужо пройдзеным — таксама розныя рэчы. Многія лічаць, што часта адзнакі ўспрымаюцца не як аб'ектыўны інструмент, які дапамагае вызначыць узровень ведаў, а як карны або заахвочвальны. Атрыманне нездавальняючай адзнакі часта носіць эмацыянальную афарбоўку: яна можа як матываваць вучня на паляпшэнне паспяховасці, так і выклікаць у навакольных гнеў, пачуццё ўласнай перавагі, правакаваць канфлікты ці траўмаваць вучняў. У некаторых класах гэта працуе наадварот, і з неадабрэннем сустракаюцца добрыя адзнакі, атрыманыя аднакласнікам. Такім чынам **у вучняў можа ўзнікаць страх перад здзяйсненнем памылак, хоць апошнія ў працэсе навучання проста непазбежныя.** Падобная боязь правакуе аналагічныя сітуацыі ў будучыні: на рынак працы выходзіць вялікая колькасць неэфектыўных супрацоўнікаў, якія баяцца здзейсніць памылку і негатовыя ўзяць на сябе адказнасць.

А што думаюць пра школьныя адзнакі выпускнікі? Паколькі сярэдні бал улічваецца пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, многія з тых, хто збіраецца працягваць адукацыю, зацікаўлены ў атрыманні максімальна высокага сярэдняга бала атэстата аб сярэдняй адукацыі. Шчыра кажучы, зацікаўлены ў гэтым і настаўнікі (у тым ліку і для справаздачнасці). Заканамерна, што большасць рэспандэнтаў лічаць ацэнкі важнымі ці вельмі важнымі. Крайнюю ступень важнасці адзнак для сябе адзначаюць амаль 16 % рэспандэнтаў. Яны ўпэўнены, што ад іх залежыць будучыня! Гэтыя ўяўленні могуць быць у пэўным сэнсе ідэалістычнымі і здольныя спраўакаваць жаданне атрымаць добрую адзнаку любой цаной, замест таго каб сканцэнтравацца непасрэдна на вучобе.

Больш за палову рэспандэнтаў паведамілі, што ў найбольшай ступені на паспяховасць уплывае пастаянная работа з вучэбным матэрыялам у школе і дома. Наступны за ім па частаце выбару адказ — «уменне запамінаць вялікія аб'ёмы інфармацыі» (так лічаць больш як 40 %).

На думку экспертаў, высокая папулярнасць гэтага варыянту адказу можа быць індыкатарам таго, што **сістэма адукацыі працуе ў напрамку завучвання, а не разумення і ўмення рэфлексаваць і выбудоўваць прычынна-выніковыя сувязі.** Некаторыя з іх адзначаюць, што ў пэўным сэнсе завучванне — шлях найменшага супраціўлення як для вучняў, так і для настаўнікаў. Тым не менш выніковасць такога навучання застаецца сумнеўнай, паколькі падобны падыход не дазваляе развіць ні кагнітыўныя, ні прыкладныя навыкі ў вучняў і фарміруе малаэфектыўных удзельнікаў рынку працы ў будучыні.

Варта звярнуць увагу і на тое, што рэспандэнты часцей выбіралі ў якасці фактару паспяховасці шанцаванне, чым дапамогу рэпетытараў. 23 % заявілі, што істотны ўплыў на адзнакі аказвае ўменне спісваць, а 21 % згадалі добрыя адносіны з настаўнікам і яго асабістае стаўленне да вучня. Эксперты адзначаюць, што культура спісвання, уласцівая беларускім школьнікам і студэнтам, у доўгатэрміновай перспектыве таксама прыводзіць да негатыўных наступстваў: раней ці пазней тыя сутыкаюцца з цяжкасцямі, калі працягваюць навучанне на больш высокай ступені ці выходзяць на працу.

## Пустое марнаванне часу?

На пытанне «Чым павінна займацца школа?» 82,5 % рэспандэнтаў адказалі, што яе задача — перадача ведаў. Астатнія пункты (развіццё асобы, творчых здольнасцяў, выхаванне) выбіраюць значна радзей, што, на думку педагогаў, некалькі супярэчыць са праўднаму прадвызначэнню школы, якая павінна займацца ўсімі пералічанымі аспектамі, хоць і не ў роўнай ступені. Некаторыя з іх завастрылі ўвагу на тым, што развіццё творчых здольнасцяў вучняў выбірае не так шмат рэспандэнтаў, як яны чакалі, хоць, на іх погляд, гэта задача школы не менш важная, чым перадача ведаў.

Для таго, каб яшчэ лепш зразумець, як ставяцца да праведзеных у школе адзінаццаці гадоў выпускнікі, ім задалі пытанне «Чым, найперш для вас, з'яўляецца школьная адукацыя?». Найбольшая колькасць рэспандэнтаў лічаць яе магчымасцю для атрымання патрэбных ведаў і навыкаў. Як магчымасць адукацыю часцей за ўсіх разглядаюць выпускнікі ліцэяў і каледжаў, а як неабходнасць — вучні агульнаадукацыйных школ і гімназічных класаў. **Найбольшая колькасць тых, хто разглядае адукацыю як аснову для асобаснага развіцця, належаць да сем'яў з зусім невялікім даходам.**

Больш за трэціну апытаных называюць школу неабходнай умовай для паступлення ў ВНУ. «Для гэтай групы людзей сярэдняя адукацыя з'яўляецца толькі доўгай падрыхтоўкай да чагосьці насамрэч важнага і не мае каштоўнасці сама па сабе», — робяць высновы эксперты. **А 8 % удзельнікаў апытання і ўвогуле лічаць сваё навучанне ў школе пустым марнаваннем часу.**

Найбольш важнымі прадметамі рэспандэнты назвалі замежную і рускую мовы, матэматыку, медыцынскую падрыхтоўку і інфарматыку. Але, адказваючы на пытанне, якія прадметы спатрэбіліся ім пасля школы, 53 % назвалі рускую мову, 16 % — беларускую, 7,6 % — матэматыку, 4,4 % — замежную мову. Актуальнасць жа іншых школьных дысцыплін выпускнікі ацанілі яшчэ ніжэй — ад 0 % (як, напрыклад, астраномію) да 3,4 % (як інфарматыку).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Адна з найлепшых

# ДЗЯСЯТКА СЯМЕЙСТВА РАМАШКАЎ

## Турызм, вегетарыянства, прыродны фітнес і шчасце ўсынаўлення

**Мужа яна знайшла ў небе, а васьмёра дзетак прыйшлі, калі сэрца падказала, што прагне мацярынства. Таццяна Рамашка ўпэўнена, што для ўсяго існуе свой час, а з жыцця нельга прыбіраць дробязі, каб не рабіць яго стэрыльным. Яна — усмешлівая і мудрая жанчына, ветлівая і цікавая гаспадыня, пяшчотная і разумная мама. А яшчэ... адна з пераможцаў X Рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года», якая сёння атрымае ад Беларускага саюза жанчын пачэсную ўзнагароду ў намінацыі «Мацярынская слава».**



### Зайшоўшы на вяршыню, трэба з яе спусціцца

Карэспандэнты «Звязды» завіталі ва ўтульны дом Рамашкаў да свята — адпачылі ў медытацыйнай зале, паабедалі найсмачнейшымі вегетарыянскімі стравамі, пазнаёміліся з сабакам Джэкам і некалькімі катамі і выйшлі з адчуваннем, што ў нашым жыцці таксама павінна адбыцца нешта добрае. Такі ўплыў аказвае на людзей гэтая жанчына.

Яе жыццё складаецца з асобных, максімальна насычаных адметнымі падзеямі, цікавымі стасункамі і шчырым шчасцем, перыядаў. Сем гадоў Таццяна, як яна кажа, «служыла людзям і праходзіла практычна-прыкладную псіхалогію за прылаўкам, працуючы ў сферы гандлю». А завочна вучылася на гістарычным факультэце.

У гэты ж час яна пазнаёмілася са сваім будучым мужам.

— У канцы 80-х — пачатку 90-х людзі хаваліся ад грубасці жыцця, сыходзячы ў горы, лясы... Гэта быў час росквіту турызму. Мы разам з Андрэем аказаліся ў адным самалёце — ляцелі на Цянь Шань. Так і знайшліся.

Пасля была праца ў фірме мужа. Таццяне спатрэбілася фінансавая адукацыя, і другую вышэйшую яна атрымала на вячэрнім аддзяленні. Кар'ера ішла ўгару, усё атрымлівалася. Аднак, як лічыць Таццяна, «зайшоўшы на нейкую вяршыню, лепш спусціцца адтуль, бо адзін ты нічога не зробіш. Трэба сабраць сямейную каманду і правесці па маршруце, што прайшоў сам».

Паўтара года ёй давялося папрацаваць у Міністэрстве фінансаў, ва ўпраўленні кадравай палітыкі. Маючы багаты вопыт работы з людзьмі, яна арганізавала там прафсаюзны рух, выконвала розныя грамадскія нагрузкі.

— Пасля я зразумела, што мая рэалізацыя ў адной, другой, трэцяй сферах — гэта ўсё прыступкі да таго, што засталося нязадзейненым у жыцці, — да мацярынства.

### Не важна, дзе запэцкаўся, — хадзем мыцца

Першыя два хлопчыкі з'явіліся ў Рамашкаў у 2008 годзе. Браты: 14-гадовы Саша і 6-гадовы Коля, як маркуюць сужэнцы, падыходзілі ім па ўзросце. На той момант ёй было 43, а мужу — 48.

— Мы не ведалі, што нас чакае, таму страшна не было, — са смехам адказвае яна на маё пытанне. — Праз год зразумелі, што нам патрэбны дзяўчаткі. Асабліва для Колі, які пайшоў у першы клас. Трэба было ўмацаваць яго дзяцінства і стварыць атмасферу братоў і сясцёр. Так з'явілася Дар'я, і яны разам пайшлі ў другі клас. Пасля — малыя: Вераніка (2,7 года) і на паўгода старэйшая за яе Дзіяна.

— Да Веранікі мы спачатку прыходзілі ў інфекцыйную бальніцу, і праваднікам да яе сэрца стала наша Даша. На трэці раз малая заснула ў мяне на каленях — так пайшоў працэс прыняцця, — дзеліцца ўспамінамі наша гераіня. — Пасля мы пераехалі ў вялікі дом і зразумелі, што рэсурсы, асабліва фізічныя, дазваляюць узяць яшчэ дзяцей. Калі ты фізічна можаш узняць дзіця, гэта трэба рабіць нягледзячы на фінансавы бок.

Ілью, які ўсе свае 10 гадоў правёў у дзіцячым доме, Рамашкі знайшлі на сайце dadomu.by. А Артура забралі з дома сямейнага тыпу, дзе нешта пайшло не так. У Таццяны і Андрэя ён паціху акрыяў. Стаў лепш вучыцца, хоць з гэтым раней былі праблемы. Вось толькі б яшчэ дагнаць равеснікаў у росце... Трэцякласнік Артур пакуль больш нагадвае выпускніка дзіцячага садка. Яго разам з мамай мы першым сустрэлі на прыпынку, калі ехалі ў госці да Рамашкаў. Ён паўтараў верш на англійскай мове, усміхаўся і яшчэ доўга махаў маці з аўтобуса, пакуль той не схаваўся за паваротам.

Дзяўчынка Яна прыйшла ў сям'ю нечакана.

— 25 снежня нам сказалі, што ёсць дзяўчынка, якая дагэтуль жыла з бабуляй, а пасля яе смерці панічна баіцца дзіцячага дома і хоча жыць у сям'і. Так яна прыехала да нас, — проста гаворыць шматдзетная мама. — Калі ты раскрываеш абдымкі насустрач дзіцяці — яно адкрые іх табе. Нездарма на Усходзе ёсць выраз: калі ты абдымаеш сірату — цябе абдымае Бог. Я не вельмі паглыбляюся ў папярэднія гісторыі дзяцей. Прымаю іх такімі, якія яны ёсць. З моманту, як яны трапляюць да нас, іх гісторыя пачынаецца з чыстага ліста і мінулае ўжо не мае ніякага значэння. Не важна, дзе чалавек запэцкаўся, — хадзем мыцца! Проста трэба сачыць за чысцінёй свайго жыцця: цела, мовы, учынкаў, стасункаў з дзецьмі.

### Калі працуеш Папялушкай, згублены туфлік абавязкова знойдзецца

У вялікім катэджы, пошукі месца для якога сям'я пачала яшчэ ў 2010-м, Рамашкі жывуць ужо шэсць гадоў.

— Спачатку нам хацелася жыць на прыродзе, таму шукалі прапановы і прыгожыя мясціны ў радыусе 20 кіламетраў ад сталіцы. А аднойчы перакінулі пошук у сам Мінск і літаральна праз гадзіну знайшлі гэты ўчастак, — радуецца Таццяна. — І гэта правільна, бо і школа побач, і крама непадалёк, і Цнянскае вадасховішча, і зямля тут добрая, сялянская. Кальцавой аўтадарогай пад'езд пэўным чынам адгароджаны, і гарадскі аўтобус па раскладзе ходзіць.



Дом будавалі самі, уже ведаючы, што трэба прасторнае месца для вялікага сямейства. Участак, здаецца, і не надта вялікі, але змясцілася тут шмат. Вось лазня з парылкай, куды ходзяць не толькі людзі, але і адзін з гаспадарскіх катоў. Вось дзве цяпліцы, дзе Таццяна ўмудраецца вырасціць столькі ўласнай агародніны, што хапае сямейству на паўгода. Уздоўж плота — вінаградныя лозы, там кусты парэчак, там яблынькі ды грушы. Нават грэцкі арэх ёсць, прычым з арэхамі. А яшчэ газоны, дзе можна паваляцца і пагушкацца на арэлях і куды летам выносяць «гняздо» — вялікае ўтульнае крэсла, якое ўзімку стаіць у доме.

— Мы часта хочам атрымаць ад жыцця адразу ўсё, што заслугоўваем. Але жыццё можа лічыць па-іншаму. Таму трэба найлепшым чынам рабіць тое, што табе прапануецца цяпер, — упэўнена гаспадыня. — Калі працуеш Папялушкай, згублены туфлік абавязкова знойдзецца.

### Прыродны фітнес

Муж і жонка, як лічыць Таццяна, гэта бакавінкі адной лесвіцы, або сцены з дахам. Ніводны не важнейшы, а проста дапаўняе другога. Пры гэтым на розных этапах развіцця хтосьці з іх можа вырывацца наперад і быць больш падкаваным у той ці іншай галіне.

Гледзячы на мужа, які не есць мяса з 18 гадоў, яна стала вегетарыянкай. Праўда, каб клеткі арганізма перабудаваліся, спатрэбілася пяць гадоў. Цяпер усё сямейства Рамашкаў вегетарыянцы, хоць нікога да гэтага не прымушаюць.

Сямейны перыяд жыцця аваладаў Таццянай цалкам. З'явілася пачуццё напоўненасці і задаволенасці, знайшоўся той элемент «пазла», якога не хапала.

— Аднак гэта пачуццё прыйшло не адразу, — кажа яна, — а тады, калі я ўбачыла, што дзеці шчаслівыя, што ім са мной добра.

Таццяна мяркуе дапамагаць дзецям, пакуль яны дастаткова не пасталеюць, але і потым будзе ўдзельнічаць у іх жыцці. Спачатку школа, пасля студэнцтва, пачатак іх уласных сямейных адносін, унукі, каляскі — усё гэта хвалюе жанчыну, якая б з радасцю пагадзілася, каб дзеці жылі разам з ёю як мага даўжэй.

— Я б яшчэ пару паверхаў надбудавала. І бабуляй ужо хоць сёння стала б, — смяецца яна. — Аднак жыццё віруе, і дзеці будуць падхоплены гэтым патокам. Наколькі далёка іх аднясе — пакажа час.

Ім самім трэба сустрэцца з выклікамі жыцця, яго спакусамі, але мы ёсць, мы побач, да нас заўжды можна вярнуцца.

Дзецям трэба шмат і рознага, і атрымліваць гэта яны павінны ад розных людзей, якія могуць падзяліцца сваім вопытам, актыўнасцю, перакананнямі, упэўнены Рамашкі:

— Кожную суботу выязджаем у лес з іншымі сем'ямі, чалавек 30 збіраецца. Там у размовах, стасунках мы сваім вопытам дапамагаем малым. Пасля пяці дзён працы трэба адпачываць, даваць нагрузку целу. Нават заняткі фітнесам — гэта ў горадзе. А ў нас у лесе прыродны фітнес.

Акрамя пешага турызму, калі сямейства можа за дзень адмахаць 20 кіламетраў, яны выбіраюцца ў Крым, на Каўказ, у Індыю. Дзяўчаткі-Рамашкі, дарэчы, займаюцца індыйскімі танцамі. А яшчэ ўсім сямействам ці па некалькі чалавек яны часта вандруюць на веласіпедах.

### Блаславенне неба — жыць пад аховай бацькоў

Сама Таццяна — позняе дзіця ў сваіх бацькоў, і якраз стасункаў з дарослымі і іх вопыту ў яе было ўдосталь.

— Бацькі заўжды мацнейшыя за нас і аддаюць нам больш, чым атрымліваюць. Яны як дубы, якія з часам усё больш трывалыя.

Маці Таццяны жыла разам з імі з 1997 года. Трапіўшы ў сталіцу, яна вяла актыўнае жыццё, спявала ў хоры «Баявыя сяброўкі» і спачатку не разумела рашэння дачкі ўзяць дзетак. Аднак пасля стала цудоўнай бабуляй, якую унукі вельмі любілі.

— Дзіця чужое — толькі на адлегласці. Тады спрацоўвае розум. А калі малы побач — спрацоўвае сэрца, яно не можа не прыняць, не палюбіць дзіця, якому патрэбна абарона, — кажа Таццяна. — Жанчына павінна хацець дзяцей, павінна любіць іх, інакш у ёй нешта не так. Любіць для жанчыны — гэта яе прэрагатыва. Калі няма любві да дзяцей, то яна пераключаецца на ілюзорнае — пачынае любіць прафесію, адукацыю.

Бацька Андрэя разам з Рамашкамі з самага іх вяселля. Ён адзін гадаваў двух сыноў, калі жонка заўчасна пайшла з жыцця. І заўжды захоўваў ёй вернасць.

— Я вельмі ўдзячна, што ён працягвае патранаваць нас з мужам цяпер. Кволы звонку, кепска бачыць і перасоўваецца на калясцы, ён моцны ўнутры, і яго ўнутраны дух, накопленая за жыццё сіла і мудрасць падтрымліваюць гэты дом. Калі нашы старыя не побач з намі, то гэтая сіла губляецца, бо яе няма каму аддаць, застаецца толькі немач. Гэта блаславенне неба — жыць са сваімі бацькамі, пад іх аховай.

Калі развіталіся з гэтым сямействам, чамусьці падалося, што дзетак тут неўзабаве стане больш, і вялікіх, і маленькіх, а галоўнае — шчаслівых і задаволеных, як і іх бацькі.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**
*Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
## по продаже земельных участков в частную собственность в г. Гомеле № 1-Эл/2018

**Организатор электронных торгов:** Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр».
**Местонахождение:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 149, каб. 3–6, 3–14, тел. + 375 2330 41 97 86.
**Продавец предмета электронных торгов:** Гомельский городской исполнительный комитет.
**Местонахождение:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Советская, 16, тел.: + 375 2330 31 09 48, 32 90 24.
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by
**Дата проведения электронных торгов:** 19 апреля 2018 года.
**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы по подготовке, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | по ул. Ореховой (район жилого дома № 45) в микрорайоне «Костюковка» | 340100000011000068 | 0,0532 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | охранная зона электрических сетей, охранная зона сетей и сооружений водоснабжения | 5 590,34 | 400,00 | 2 634,18 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 2 | по ул. Витебской 1-й, 68 (участок № 1) | 340100000002005951 | 0,0955 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | ограничений в использовании не имеет | 32 904,18 | 400,00 | 2 276,28 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 3 | по пер. Виноградному 4-му | 340100000002006062 | 0,0948 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | охранная зона объектов газораспределительной системы | 13 935,11 | 400,00 | 2 835,67 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 4 | в районе пер. Виноградного 3-го и пер. Виноградного 4-го (участок № 2) | 340100000002006051 | 0,0863 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | охранная зона сетей и сооружений водоснабжения | 12 635,34 | 400,00 | 2 433,23 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 5 | в районе пер. Виноградного 3-го и пер. Виноградного 4-го (участок № 4) | 340100000002006053 | 0,0904 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | охранная зона сетей и сооружений водоснабжения | 13 235,63 | 400,00 | 2 433,23 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 6 | в районе улиц Гвоздичная и Аграрная (участок № 6) | 340100000002005973 | 0,1266 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | ограничений в использовании не имеет | 21 848,98 | 400,00 | 2 367,08 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 7 | в районе улиц Гвоздичная и Аграрная (участок № 7) | 340100000002005972 | 0,1253 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | ограничений в использовании не имеет | 21 624,62 | 400,00 | 2 350,78 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 8 | по пер. Староволотовскому 1-му, 4 | 340100000002005893 | 0,0949 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | водоохранная зона рек и водоемов, охранная зона сетей и сооружений водоснабжения | 30 138,91 | 400,00 | 2 465,64 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 9 | по пер. Староволотовскому 1-му, 5 | 340100000002005884 | 0,1000 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | водоохранная зона рек и водоемов, охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы | 31 989,84 | 400,00 | 2 535,37 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 10 | по пер. Староволотовскому 1-му, 6 | 340100000002005957 | 0,0949 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | водоохранная зона рек и водоемов, охранная зона сетей и сооружений водоснабжения | 28 987,21 | 400,00 | 2 433,73 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |

1. Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY602AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к нему документами – **12 апреля 2018 года, 15.00**
2. Желающие принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов вносят задатки в размере, установленного для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится самостоятельно.
3. Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 г. №143.
4. В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов обязан: возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов; возместить расходы, связанные с формированием землеустроительного дела на земельный участок, в том числе и с государственной регистрацией; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.
5. После совершения победителем электронных торгов указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, Организатор электронных торгов передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника»

| | | Местонахождение | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Шесть единиц капитальных строений:<br>1. Здание склада (литер А 2/к) с инв. № 500/С-8445. Площадь – 2195 кв. м, г. п. – 1954, этажей – 2.<br>2. Здание проходной (литер Б 1/к) с инв. № 500/С-8494. Площадь – 10,1 кв. м, г. п. – 1953, этажей – 1.<br>3. Здание специализированное автомобильного транспорта (литер Ж 1/к) с инв. № 500/С-36553. Площадь – 21,1 кв. м, г. п. – 1996, этажей – 1.<br>4. Гараж (литер В 1/м) с инв. № 500/С-23647. Площадь – 74,2 кв. м, г. п. – 1988, этажей – 1.<br>5. Гараж (литер Д 1/м) с инв. № 500/С-23648. Площадь – 46 кв. м, г. п. – 1988, этажей – 1.<br>6. Гараж (литер Г 1/м) с инвентарным номером 500/С-23649. Площадь – 109,9 кв. м, г. п. – 1988, этажей – 1 | г. Минск, ул. Чапаева, д. 4 | 995 400,00 | 9 954,00 | 49 770,00 |

Земельный участок площадью 0,4575 га с кадастровым номером 500000000001000440. Целевое назначение – для эксплуатации и обслуживания административного здания. Право временного пользования. Срок действия по 31.05.2021. Описание права, ограничения (обременения) прав: Охранная зона водопровода, площадь 0,0583 га; Охранная зона трубопроводов, площадь 0,1539 га; Обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ, площадь 0,4575 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

В отношении Лота № 1 проводятся четвертые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 08.11.2017 г. в газете «Звязда».
Цена на предмет торгов снижена на 40 %. Окончание приема заявлений в 15.00 05.04.2018 г.

| | | Местонахождение | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 2 | Изолированное помещение (Помещение гостиницы) с инв. №714/D-11556. Площадь – 196,5 кв. м, г. п. – 1994, этажей – 1 | Могилевская обл., Осиповичский р-н, г. Осиповичи, ул. 60 лет Октября, д. 15 | 45 024,00 | 450,24 | 2 251,20 |

Земельный участок площадью 0,1076 га с кадастровым номером 724850100001000516. Право постоянного пользования. Доля РУП «Жилкоммунтехника» составляет 11/200. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

В отношении Лота № 2 проводятся третьи повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 08.11.2017 г. в газете «Звязда».
Цена на предмет торгов снижена на 30 %. Окончание приема заявлений в 15.00 05.04.2018 г.

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник, явился для участия в аукционе, и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.
Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в течение 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона, а также затраты по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by, на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 06.04.2018 в 15.00 (регистрация участников с 14.30 до 14.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 720**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/torgi
До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000 в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344.
Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №__), проводимом 06 апреля 2018 г.
Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1122.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Мацюк Андрей Богданович, тел. 8 (029) 698 51 76.
Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.
Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

**Организатор аукциона – ООО «Фрондера», тел. 8 (029) 305 86 50 • e-mail: frondera@mail.ru**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего на праве хозяйственного ведения УП «Настурция»

**Лот № 1.**
1. Наименование: здание магазина с инвентарным номером 500/С-18169. Назначение: здание специализированное розничной торговли. Г. п. – 1962. Этажность – 1. Общая площадь – 1 447,4 кв. м. Адрес: г. Минск, пер. Козлова, д. 5.
2. Наименование: Б 1/к Здание склада с инвентарным номером 500/С-31634. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Г. п. – 1992. Этажность – 1. Общая площадь – 150 кв. м. Адрес: г. Минск, пер. Козлова, 5/1.
3. Рекламная конструкция «Пилон двухсторонний с внешней подсветкой» с инвентарным номером 22 согласно инвентарной карточке учета основных средств. Адрес размещения: г. Минск, ул. Долгобродская, 14 – пер. Козлова.

**Начальная цена – 1 410 840,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.**
**Задаток – 150 000,00 бел. руб. Шаг аукциона 5 %**

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 0,2278 га с кадастровым номером 500000000001001264. Целевое назначение земельного участка: эксплуатация здания магазина. Право постоянного пользования.
Ограничения (обременения): обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ эксплуатационным организациям – владельцам инженерных коммуникаций, площадь 0,2278 га.
Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Аренда: 1. Здание магазина с инвентарным номером 500/С-18169 сдается по договору аренды (площадь, сдаваемая в аренду 201,35 кв. м), срок действия договора аренды по 31.12.2018; 2. Б 1/к Здание склада с инвентарным номером 500/С-31634 сдается по договору аренды (площадь, сдаваемая в аренду 150 кв. м), срок действия договора аренды по 24.04.2018

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Лота № 1 в течение 7 (семи) календарных дней с назначенной даты проведения аукциона.
2. Условия оплаты, приобретенного на аукционе Лота № 1: 30 % стоимости приобретенного на аукционе Лота № 1 оплачивается Победителем аукциона (Претендентом на покупку) Продавцу в течение 14 (четырнадцати) календарных дней с даты подписания договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается Победителем аукциона (Претендентом на покупку) Продавцу равными частями в течение 3 (трех) месяцев.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,5 % (ноль целых пять десятых процента) от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. Фактическая передача Лота № 1 осуществляется после полной оплаты стоимости приобретенного на аукционе Лота № 1 в сроки, установленные договором купли-продажи между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.
5. Обязанность по оформлению всех документов для заключения сделки купли-продажи Лота № 1, а также оплата расходов, связанных с оформлением сделки, включая возмещение расходов по государственной регистрации недвижимого имущества, возлагаются на Победителя аукциона (Претендента на покупку).
6. На территории Лота № 1 есть дополнительное имущество (ворота откатные, ворота распашные), которое может быть передано Победителю аукциона (Претенденту на покупку) по договоренности сторон.
7. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством и настоящим договором для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 19.04.2018 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества УП «Настурция», проводимом 19 апреля 2018 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 14.04.2018 в 11.00. Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Григоркевич Жаклин Владимировна, тел.: +375 (17) 245 12 12, +375 (33) 635 11 22.

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
## «ПРИВИЛЕГИЯ НА УДАЧУ»

**Сведения об организаторе:**
Общество с ограниченной ответственностью «360 медиа групп», далее именуемое «Организатор», адрес: 223054, Минская обл., Минский р-н, аг. Острошицкий Городок, ул. Ленина 1-3, каб. 3-1-14. Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета № 0046451 от 11 апреля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690318126, свидетельство о государственной регистрации выдано 24 апреля 2008 г.
**Наименование Рекламной игры:**
Рекламная игра носит название «Привилегия на удачу».
**Сроки проведения Рекламной игры:**
Рекламная игра проводится с 12 января 2018 года по 28 марта 2018 года (включая период розыгрышей и вручения призов).
**Сведения о государственной регистрации Рекламной игры:**
Свидетельство о регистрации Рекламной игры № 3184 от 22 декабря 2017 года выдано Министерством торговли Республики Беларусь.
**Количество участников Рекламной игры:**
Всего к участию в игре было допущено 452 участника, полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры.
**Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:**
Призовой фонд в размере 18 369 (восемнадцать тысяч триста шестьдесят девять) BYN 87 (восемьдесят семь) копеек разыгран полностью.
**Победители по результатам розыгрыша от 5 марта 2017 года:**
50 победителей – приз Кружка МОССА черная, с логотипом /Польша/
50 победителей – приз Кружка МОССА красная, с логотипом /Россия/
50 победителей – приз Кружка МОССА черная, с логотипом /Беларусь/
50 победителей – приз Кружка МОССА белая, с логотипом /Беларусь/
350 победителей – приз 2 билета на премьерный показ фильма «Первому игроку приготовиться» в кинотеатре Velcom Cinema в 20.50 29 марта 2018 года.
*полную информацию о победителях смотрите на сайте www.360.by
**Приз: Подарочный сертификат на услуги компании ООО «Первая туристическая компания» на сумму 10 000 BYN и денежный приз для уплаты подоходного налога в размере 1477,67 BYN.**
Малахова Ольга Анатольевна
**Сведения о наименовании и дате выхода печатного средства массовой информации, в котором опубликованы правила проведения Рекламной игры и сведения о результатах проведения Рекламной игры:**
Публикация правил Рекламной игры – газета «Звязда», № 6 10.01.2018 г.
Публикация сведений о результатах проведения Рекламной игры – № 52 17.03.2018 г.
Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры + 375 17 239 07 91.

# Нічога не забываецца

## ЗДРАДНІКАМ ЛІТАСЦІ НЕ БЫЛО

З Уладзімірам Апанасавічам Шкабарыным мне даводзіцца сустракацца нярэдка. Яшчэ б! Суседзі. То ўбачу яго на вуліцы, то ў краме, то на Цэнтральным рынку, а то і да сябе ён запросіць. Так, для размовы. А ведаю я яго, як і ён мяне, з сямідзясятых гадоў мінулага стагоддзя, калі ў абласной газеце «Гомельская праўда» быў надрукаваны мой нарыс пра наватара вытворчасці Шкабарына, токара-расточніка Гомельскага станкабудаўнічага завода імя Кірава, калі яму ўручылі працоўны ордэн.

Тым разам Уладзімір Апанасавіч сціпла прамаўчаў, што згаданы ордэн — не першая яго дзяржаўная ўзнагарода. Шмат гадоў таму ва ўрачыстай абстаноўцы яму ўручылі медаль «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» II ступені. Падпольшчыку і народнаму мсціўцу Валодзю на той час споўнілася ўсяго 16 гадоў.

А гэтай зімой Уладзіміру Апанасавічу пераваліла ўжо за дзевяноста. Перагортваючы ў думках старонкі свайго нялёгкага жыцця, ён нічога не ўпускае з учэпістай памяці. Калі б і хацеў пра штосьці забыць, кажа, дык не атрымліваецца, бо забыць нельга. Напрыклад, як бацька Апанас Гурынавіч, адзін з кіраўнікоў Аршанскага падполля, прыцягнуў яго да змагання з ворагам. Як быў ён сувязным злучнікам з тылу разведвальнай групы Канстанціна Дудчанкі. Як апынуўся пасля расстрэлу бацькі, а потым і маці Васілісы Цітаўны, у партызанскім атрадзе, які пасля ўвайшоў у брыгаду легендарнага Канстанціна Заслонава. Як удзельнічаў ва ўсіх баявых аперацыях. Як шмат разоў трапляў у такія небяспечныя пераплёты, што, здавалася, не выкруціцца з іх.

Аб усім гэтым і іншым ветэран вайны і працы, калі яго запрашаюць у школы, ліцэі і каледжы, і расказвае моладзі. Ён глыбока перакананы ў тым, што юнаму пакаленню не проста важна, а вельмі важна паслухаць тых, хто дзеля іхняга шчасця, дзеля мірнага неба з годнасцю прайшоў праз усе вогненныя віхуры.

Аднойчы Уладзіміра Апанасавіча спыталі, а ці былі сярод партызанаў здраднікі? Усякае было, сказаў ён. І прывёў такія прыклады.

...Ноччу па шалашах, у якіх спалі партызаны, нехта адкрыў страляніну. Атрад быў падняты па трывозе, пачалася пераклічка. На месцы не аказалася двух мужыкоў. А праз месяц за больш як дваццаць кіламетраў ад дыслакацыі атрада ў лясной глушы была выяўлена замаскіраваная зямлянка. Яе выкапалі тыя ўцекачы-здраднікі, якія рабавалі насельніцтва суседніх вёсак.

Да іх праз каторы час быў укаранёны выхаванец дзетдома, разведчык атрада. Калі тыя двое адправіліся ў вёску па самагон, ён арганізаваў засаду партызан. Здраднікаў узялі «цёпленькімі».

— Вядома ж, юдаў спасцігла суровая кара, — працягваў далей Уладзімір Апанасавіч і расказаў наступную гісторыю.

У іхнім атрадзе быў партызан па імені Кузя. У самым пачатку вайны ён трапіў у палон да немцаў і даў згоду ўвайсці ў каманду генерала-здрадніка Уласава. Пазней рота Караткова, у якой апынуўся тады Кузя, перайшла на бок партызан. А тут неўзабаве новыя войскі уласаўцаў узялі ў акружэнне той атрад. Выйсце было толькі такое — разбіцца на групы і паасобку выходзіць з яго. А перад гэтым адна з груп зайшла ў пасёлак, дзе засталося ацалелымі ўсяго тры хаты. Перакусілі там, а кулямётчык кажа: яго памочнік Кузя некуды знік. Па следзе вызначылі: той да ўласаўцаў напрамак узяў.

— Нам потым вось што расказала гаспадыня хаты, у якой жыў камандзір уласаўскага батальёна, — апавядаў Уладзімір Апанасавіч. — Прыйшоў да яго Кузя і кажа: «Прыміце мяне назад. Ведаю, дзе партызаны закапалі бочку з сухарамі». — А той — у адказ: «Табе было дрэнна ў нямецкім палоне. Дрэнна і ў арміі Уласава. І ў партызан таксама дрэнна? Расстраляць!».

Што і было зроблена...

— Дзеці, любіце сваю Радзіму. Аберагайце яе ад усіх бед, — такімі словамі Уладзімір Апанасавіч звычайна заканчвае свае сустрэчы з моладдзю...

## ЮРКА — БУДУЧЫ НАСТАЎНІК

У гэту вёску, што раскінулася паўкругам на высокім беразе Сожа, Юрку прывезлі з горада на цэлыя летнія канікулы яго бацькі-інжынеры. Яны хацелі, каб ён тут, на свежым паветры, на малачку-тваражку сіл набіраўся і жыццё спазнаваў. Бо спадзяваліся, што пасля школы ён вывучыцца на настаўніка, якому, мабыць, давядзецца працаваць, калі хочаш, на сяле. Таму няхай змалку прывыкае да ўсяго. А гэта, як выявілася пасля, было для яго цэлай праблемай.

Узяць, напрыклад, самае простае. Калі карова Зорка пасля вяртання з пашы на двары ў цёткі Манькі (сястры Юркавага бацькі) зарыкае громка — маўляў, даіць пара! — дык трынаццацігадовы хлапец вушы затыкае і дрыжыць ад страху: ці не пойдзе яна на яго ў атаку? А калі гусак тут жа, на двары, злосна засіпіць ды ўчэпіцца ў яго штаніну (а такое было неаднойчы) дык ён так верашчаў, што можна было падумаць: яго рэжуць.

Гэтыя і іншыя слабінкі ў паводзінах Юркі добра вывучылі яго стрыечны брат Мішка (сын цёткі Манькі) са сваім дружбаком Лёнькам. Яны, аторвы, рознымі шляхамі стараліся вытравіць з яго тыя слабінкі, выхаваць адвагу. Паймаюць на лузе вужаку, пакладуць яго сабе ў картуз ці кішэню і ходзяць, скаляць зубы. Паўтарыць «эксперымент» Юрку запрашаюць. Таго ж ліхаманіць ад убачанага. Ні ў дугу не хоча пасмяляць. Наступная спроба прыдаць Юрку храбрасці ў Мішкі і Лёнькі заключалася ў тым, каб ноччу залезці з ім у калгасны сад. Прапанова Юрку спадабалася. Хлопцы набралі яблык пад самую завязку і толькі злезлі з дрэва, як метраў за дваццаць раскаціўся стрэл грымнуў. Мішка з Лёнькам, высыпаўшы яблыкі з запазухі, куляй паляцелі з саду, а Юрка на карачках з цяжкім грузам папоўз прэч. Да цёткі Манькі прыплёўся ён у мокрых штанах, якія давялося самому мыць.



Пасля гэтага Юрка сказаў: ні на якія падобныя штучкі яго ніхто не ўгаворыць. Хіба толькі на рыбалку ён схадзіць згодзіцца. Сябрукі на ўра прапанову яго прынялі. Падумалі: калі сам ініцыятыву праяўляць стаў, значыць, намаганні іхнія не марныя, плён даюць. Сваім чалавекам у вёсцы Юрка становіцца. І, узброіўшы яго таптухай, да Нямышша павялі. Азярынка гэта такая. Балацянка. Невялічкая, у скразным акаймленні лазняку. Уся ў расцы. Карасёў там чырвоназалацістых спрадвеку процьма. З лапаць кожны. Нібы сонцам зззяюць, калі выцягнеш з вады.

Лёнька застаўся на беражку, а Мішка і Юрка рыбачыць пайшлі. Карасі ішлі цугам. Не лапці, праўда, а ўсё роўна, ладныя. З далонь. І ўсё ішло добра, пакуль вада не ўскаламуцілася і ў таптуху пачвары нейкія трапляць сталі. Вузкія, сантыметраў па дваццаць, з агіднай галавой, з чатырма ножкамі-лапамі і доўгім, не рыбіным, хвастом.

Юрка натапырыўся: брыдота нейкая. Уся чорна-жоўтая. Змяюка, няйначай. Яшчэ ўкусіць. А Мішка рагоча: «Трытон гэта. Вазьмі рукой яго, не бойся». Слухаць брата далей Юрка не стаў. На ўсякі пажарны выпадак шмаргануў з балацянкі, садраў з сябе штаны, сушыць іх пачаў. А на нагах, зірнуў, чатыры чорныя тлустыя «вяроўчынкі». «П'яўкі конскія, — сказаў Лёнька. — Кроў дурную высмоктваюць», — растлумачыў далей. Юрка па траве качацца пачаў, каб выслабаніцца ад крывасмокаў. Ды без толку. Лёнька ж самы апрабаваны варыянт прымяніў. Калі са свайго ўласнага «чайнічка» на тыя юркавы п'яўкі сапанаватай «вадзічкай» лінуў, дык тыя ўраз і адпалі.

У тое лета шмат новага і карыснага спазнаў у вёсцы гараджанін Юрка. Тое ж было і ў наступныя, да самага заканчэння школы, летнія канікулы. Сам адчуў: смялейшым ва ўсім стаў, больш дасведчаным. І ў гэтым, па праве лічыў ён, была вялікая заслуга Мішкі і Лёнькі.

Праз некалькі гадоў Юрый Канстанцінавіч пачаў працаваць настаўнікам біялогіі ў той вясковай школе, у якой і быў прызначаны дырэктарам. А Міхаіл Пятровіч і Леанід Паўлавіч сталі лётчыкамі грамадзянскай авіяцыі.

Зараз усе яны на заслужаным адпачынку.

## А ЯШЧЭ БЫЎ ВЫПАДАК

— Хто сказаў, што ваўкі нікога і нічога не баяцца? Што страху аніколечкі не маюць? — дзядзька Іван абвёў мужыкоў позіркам, як бы запрашаючы іх да размовы, і зацягнуўся піпкай.

Быў канец лета. Надвячорак выхаднога дня. Самы раз адпачыць тут, на абалонні, седзячы на лавачках і любуючыся захадам сонца. Ахвотнікаў паспрачацца з Данілавічам ці падтрымаць яго чамусьці не было. Таму ён звярнуўся да майго бацькі:

— Ты ж ведаеш, Грышка, якім баязлівым аказаўся той ваўчына, а маўчыш. Ці не так?

— Так, Данілавіч, так, — кіўнуў галавой мой Андрэевіч.

— Дык не цягні ты ката за хвост, — падаў голас Лёнька Бэер, — расказвай.

Дзядзька Іван прытушыў цыгарку і пачаў свой аповед. А я, падлетак, натапырыўшы вушы, сачыў за ім: ці не ўкляпае ён у гэту гісторыю якую-небудзь залiпуху? Бо ведаў яе да драбніц. І, нават, бачыў гэтага мёртвага звяругу ў дзядзькі на двары, бо нашы хаты мясціліся побач. Забягаючы наперад, скажу, што ад праўды сусед не збочыў ні на крок.

— У тую восень адбою ад ваўкоў не было. Прыбягалі яны з засажэўскіх лясоў і пачыналі свой бандытызм з нашай крайняй вуліцы. Усіх сабак перадушылі і майго Шарыка таксама, — уздыхнуў Іван Данілавіч, — да хлявоў дабірацца пачалі. Аднойчы раніцай гляджу, а ад нашай козкі засталіся толькі ножкі ды рожкі. Абследаваў я двор і выявіў падкоп воўчы. Задумаўся, як авечку, што ў суседнім засеку стаіць, ад разбойніка гэтага ўратаваць. Бо прыйдзе, ведаю, прыйдзе зноў.

Каля сцен хлеўчука Іван Данілавіч нагрувасціў дроў, бярвёнаў, цэглу паклаў. Свабодным пакінуў толькі тое месца, дзе быў засыпаны зямлёй падкоп. І разам з сынамі Іванам і Лёшкам па начах ваўка чакаць пачаў. І той праз некалькі дзён з'явіўся.

Ноч была ціхая, без ветрыку. Праз акно (па наваколлі святло месяц з неба разліваў) мужыкі пільна цікавалі за зверам. Вось ён разграбае зямлю, і, прадчуваючы лёгкую здабычу, так заюшыўся, што страціў усякую асцярожнасць. І калі амаль напалавіну ўжо залез пад хлевушок, дзядзька даў знак сынам: наперад!

Прыхапіўшы з сабой вілы, яны накінулі на звяругу кажух і гуртам наваліліся на яго. Шэры, каб вызваліцца з палону, адчайна замалаціў-зашкроб лапамі па поўсці кажуха, ды ўсё дарэмна. Прайшло колькі хвілін, і драпежнік заціх.

— Бобік здох, — канстатаваў дзядзька Іван. — Сэрца лопнула. Ад страху.

Калі мужыкі адкінулі ўбок кажух, на іх шыбанула такім смуродам, што ў Алёшкі ўсё нутро перавярнула ад ванітаў.

...Тую смярдзючую апранаху адшкрабалі і адмывалі ад дзярма цэлы тыдзень. І ўсю астатнюю восень сушылі пад павеццю на скразнячку. А зімой сплавілі кажушок якомусьці валацугу.

## СЕРАФІМА, СЕРАФІМА...

Сяргей Пятровіч трымаў курс на Цэнтральны рынак. У яго жонкі Ірыны Васілеўны сёння дзень нараджэння, і — закон жыцця: без букета кветак тут ніяк не абысціся. Дарагі па кошце падарунак ён набыў загадзя, а вось з кветкамі — не прамахнуцца б, бо на паліцах і ў кошыках гэтага тавару такая процьма, што вочы ў яго па іх разбегліся. Прыдзіраючыся прыглядаўся да колераў-красак і прыкідваў, якая з іх найбольш будзе пасаваць да залацістых валасоў Ірыначкі. А прадаўчыцы так спрытна расхвальвалі гэту прыгажосць, што Сяргей Пятровіч нават крыху разгубіўся: якія выбраць?

Напэўна, яшчэ б гадзіну сноўдаўся ён па рынку, калі б не заўважыў свайго знаёмага — Петруся Зэліка. Падыйшоў да яго, прывітаўся. Той з пахмурнелым тварам заказваў чатыры ружы.

— Каму? — сцішана спытаў.

— Серафіме. На пахаванне іду.

— Якой Серафіме? — насцярожыўся Сяргей Пятровіч.

— Бундар, — маркотна прамовіў той. — Ты яе не ведаеш.

Навіна гэта даўбнёй ударыла па галаве Харашунова. Нібы ў ступе, балюча затаўкліся думкі: Серафіма памерла... На той свет адчальвае... Яго аднакласніца... Яго першае каханне... У нейкім здранцвенні ён купіў два букеты руж — для Ірыны і Серафімы — змясціў іх у пакет і, узяўшы ў другую руку сумку з прадуктамі, паплёўся да шматпавярховіка Серафімы.

Па дарозе ажывалі і тут жа, як праз імжу, туманіліся іхнія вясковыя спатканні, што цягнуліся да самага світанку; спачатку нясмелыя, а пасля адчайна гарачыя абдымкі і пацалункі; яго правады ў армію, калі яна дала слова чакаць ды так і не стрымала яго, а выйшла замуж; дзве-тры выпадковыя сустрэчы тут, у горадзе, калі пастаялі крыху, пагаманілі, ды пацяху, з яўным шкадаваннем, развіталіся. І вось усё скончана. Няма Серафімы...

З тым жа ранейшым тлумам у галаве Сяргей Пятровіч, сцішыўшы хаду, падышоў да святлафора. І адчуў, што нехта лёгенька дакрануўся да яго пляча. Азірнуўся і ледзь не бразнуўся на асфальт. Божачка мой! Серафіма!!! Жывая! Жывенькая! З іскрыстым позіркам вачэй. Са светлай усмешкай.

Харашунова закляніла. Ні слова не мог вымавіць. Не верыў убачанаму. Прамільгнула: ці не сон гэта? Не, не сон. Агоўтаўся нарэшце, праз сілу выціснуў з сябе нешта заікастае:

— Д-д-да ц-ц-цябе... — і незнарок кінуў позірк на пакет, адкуль выглядвалі ружы.

Яна адчула яго разгубленасць, заўважыла той позірк і па-свойму зразумела ўсё гэта. Падступіла яшчэ бліжэй, прыхінулася да яго і прамовіла:

— Дзякуй за кветкі. Рада, што не забыў мяне, што памятаеш. Я таксама не забыла, памятаю. Усё-ўсё памятаю... Хадзем да нас, пазнаёмлю са сваім Алегам.

Усё ў тым жа здранцвенні-стрэсе Сяргей Пятровіч назваў прычыну, па якой не можа прыняць яе прапанову і ўручыў радаснай Серафіме букет.

Калі ён заявіўся дадому, да застолля заставалася яшчэ чатыры гадзіны. Ірына наводзіла апошні марафет у цырульні, цешча завіхалася на кухні, а цесць, крутнуўшыся каля вазы, куды зяць выставіў кветкі, і, налічыўшы іх чатыры, недаўменна спытаў, што гэта значыць? І тут у галаву Пятровіча цюкнула: што ён нарабіў! Скандал будзе, калі жонка з'явіцца! Але выйсце прыйшло нечакана.

— Тата, — супакоіў яго, — адна ружа каля пад'езда зламалася. Дрэнны знак гэта. Дык я выкінуў яе. Зараз па рынак злётаю.

Адкуль неўзабаве і прынёс букет з сямі прыгажэнных руж. А тыя чатыры размеркаваў з улікам рэкамендацый цесця наступным макарам: тры — цешчы і адну — Анютцы, сястрычцы Ірыны.

Святкаванне дня народзінаў прайшло на самым высокім узроўні.

...Назаўтра ён сустрэўся з Пятром Зэлікам, каб набіць яму морду, бо Серафіма Бондар жывая-жывенькая. І вось што пачуў у адказ: «Схадзі да ўрача і прачысці вушы. Я казаў, што памерла Серафіма Бундар, жонка майго напарніка па рабоце. А што ты пачуў — не ведаю...»

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

■ На сцэне

# АТМАСФЕРНЫ СПЕКТАКЛЬ, «АНТЫГОНА» І БРАДВЕЙ

**Гэтая падборка навін тэатра, магчыма, і не пакажа, наколькі розным можа быць тэатральнае відовішча, але некалькі яго экзэмпляраў дакладна прадэманструе. І калі брадвейская эстэтыка мае доўгую гісторыю, дакументальны тэатр яшчэ так-сяк трапляе ў сферу эксперымента, то пачнём мы з самай што ні ёсць для нашай тэрыторыі навінкі.**


«Anti[gone]».

**1.** У Беларусі ўпершыню на тэрыторыі СНД — прынамсі, так кажуць піяршчыкі — будзе пастаўлены атмасферны спектакль для дзяцей. Гэта значыць, што гледачы з завязанымі вачыма будуць спасцігаць пастаноўку праз слых, нюх і дотык, то-бок аўдыторыя аўтаматычна пашырыцца і ўключыць у сябе невідушчых і людзей з праблемамі са зрокам, што не маюць магчымасці паўнавартасна ўспрымаць традыцыйныя тэатральныя імпрэзы. Першым такім спектаклем, а магчыма, не апошнім, стане «Снежная каралева» па п'есе Рагіма Мусаева па матывах казкі Ханса Крысціяна Андэрсана — яе паставіць калектыў «Цім тэатр» з Гомеля пры генеральнай падтрымцы кампаніі velcom.

Прадстаўнікі будучы спектакль публіцы плануецца ў пачатку красавіка, і можна прадказаць яму высокую папулярнасць хоць бы з-за відавочнай выключанасці некаторых груп людзей з культурнага кантэксту краіны. Успамінаецца, якую ўвагу на кінафестывалі «Лістапад» прыцягнуў фільм Мірaслава Слабашпіцкага «Племя», нягледзячы на сваю спецыфіку незабыўляльнага кіно. Героі ў ім камунікавалі выключна на мове жэстаў, а значыць, глуханямыя маглі зразумець і ўспрыняць карціну ад пачатку да канца, таму і білеты на фільм, які ў выніку большасць гледачоў хацела б паспяхова забыць, было не купіць.

**Гледачы з завязанымі вачыма будуць спасцігаць пастаноўку праз слых, нюх і дотык, то-бок аўдыторыя аўтаматычна пашырыцца і ўключыць у сябе невідушчых і людзей з праблемамі са зрокам.**

Будучым гледачам «Снежнай каралевы», асабліва тым, хто ведае і любіць тэатр, давядзецца перажыць новыя ўражанні і задзейнічаць сваю фантазію, чаму апроч вядомага сюжэта будуць спрыяць гукавыя эфекты, вентыляцыя, пахі і іншае.

**2.** Яшчэ адзін нетрадыцыйны тэатральны праект — дакументальны спектакль «Anti[gone]» па матывах трагедыі Сафокла «Антыгона», які ўжо прагучаў у беларускай тэатральнай прасторы, — можна будзе ўбачыць у Мемарыяльным музеі-майстэрні Заіра Азгура 12 красавіка. Яго паставіў рэжысёр і акцёр, кіраўнік Цэнтра беларускай драматургіі Аляксандр Марчанка пры падтрымцы «АРТ карпарэйшн». Тут сабраны рэальныя людзі са сваімі асабістымі гісторыямі, якія на адной сцэне суседнічаюць з тэатральнай старажытнагрэчаскай Антыгонай. Са сваім прыватным выступяць маркетолаг, юрыстка, сацыёлаг, кіраўнік PR-агенцва, журналістка, выдавец, прадзюсар, спартсменка, палітолаг і актывіст.

**Дакументальны спектакль «Anti[gone]» па матывах трагедыі Сафокла «Антыгона», які ўжо прагучаў у беларускай тэатральнай прасторы, можна будзе ўбачыць у Мемарыяльным музеі-майстэрні Заіра Азгура.**

Прэм'ера спектакля «Anti[gone]» адбылася 12 чэрвеня 2017 года, ён таксама паказваўся ў беларускай праграме мінулага фестывалю «ТЭАРТ». Варта адзначыць месца — у музеі-майстэрні Заіра Азгура дзейных асоб дакументальнай пастаноўкі будуць атачаць вобразы, бюсты, выявы савецкіх лідараў, што дададуць і відовішчнасці, і дадатковых сэнсаў.

Білеты на «Anti[gone]» ужо ў продажы.

**3.** 12 сакавіка споўнілася пяць гадоў «Тэрыторыі мюзікла» — прыватнай тэатральнай кампаніі, якая працуе ў «брадвейскім» кірунку і развівае ў нашай прасторы жанр мюзікла. Тэатр быў створаны дзякуючы супрацоўніцтву беларускіх пастаноўшчыкаў і народнага артыста Расіі кампазітара Генадзя Гладкова, якое і раней мела месца на беларускай сцэне, а ў выніку склалася ў асобную фармацыю са сваімі задачамі і канцэпцыяй.

Пачаткам існавання «Тэрыторыі мюзікла» лічыцца творчы вечар Генадзя Гладкова «Формула любві» на сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі, якому папярэднічалі мюзіклы «Прыгоды брэменскіх музыкантаў», «12 крэслаў» і «Звычайны цуд» у Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры.

Сёння «Тэрыторыя мюзікла» носіць імя кампазітара і афіцыйна з ім супрацоўнічае, але кажуць, што, нават маючы свайго асноўнага аўтара, калектыў карыстаецца поўнай творчай свабодай у працы над рэпертуарам, а кіраўнікі тэатра Настасся Грыненка і Дзмітрый Якубовіч з'яўляюцца адзінымі ў Беларусі, хто стварае буйныя праекты ў кантэксце брадвейскай музычнай культуры.

Калектыў налічвае больш за пяцьдзясят супрацоўнікаў, хоць у пачатку існавання «Тэрыторыі мюзікла» іх было каля дваццаці, і на найбліжэйшы час рыхтуе дзве прэм'еры. 28 сакавіка на сцэне Палаца культуры прафсаюзаў будзе прадстаўлены рок-мюзікл у двух дзеях «Недалёка ад нормы», а ў чэрвені — новая версія мюзікла Генадзя Гладкова «Звычайны цуд».

Што важна, адной са сваіх задач «Тэрыторыя мюзікла» лічыць пошук перспектыўных беларускіх аўтараў, што можна разумець як курс на раскрыццё талентаў у беларускім Брадвеі ■


«Тэрыторыя мюзікла».

■ Выстаўка

# ФОРМА ДЛЯ СКУЛЬПТАРА

## Афрадыта і Стэфанія Станюта ў экспазіцыі твораў Уладзіміра СЛАБОДЧЫКАВА

Што галоўнае ў скульптуры? Пластычнасць, вобразнасць альбо, магчыма, філасофскі пасыл? У творчасці знакамітага беларускага скульптара Уладзіміра Слабодчыкава глядач сутыкаецца з усімі гэтымі складнікамі. Майстар, безумоўна, з'яўляецца адным з самых паспяховых скульптараў краіны. Яго работы вядомыя не толькі на радзіме, але і далёка за межамі. У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі творца прадставіў рэтраспектыўны праект «Сублімацыя формы», якім дэманструе асноўны прынцып сваёй творчасці.

...Вясковы хлопец паехаў паступаць у Акадэмію мастацтваў. У яго не было спецыяльнай падрыхтоўкі, тым больш пэўных навыкаў, аднак ён меў самае галоўнае — імкненне да скульптуры. Цяпер узначальвае адпаведную кафедру ў Акадэміі мастацтваў і дапамагае маладым людзям пракладваць шлях наперад. Уладзімір Слабодчыкаў адзначае, што, калі прыйшоў кіраваць кафедрай, яму давялося перажыць складаны перыяд: трэба было не парушыць традыцыю, захаваць спадчыну Бембеля і Анікейчыка і ў той жа час знайсці свой падыход.

**У экспазіцыі выстаўкі можна ўбачыць як Афрадыту з грэчаскай міфалогіі, так і вобраз, што нагадвае Стэфанію Станюту.**

Больш за сорак гадоў Уладзімір дэманструе ў мастацтве сваю індывідуальную пазіцыю. Займаўся самымі разнастайнымі відамі і жанрамі скульптуры, пражыў перыяд нацыянальна-арыентаваных пошукаў і фармальных эксперыментаў. Дыяпазон яго праектаў уражвае: ад камернай пластыкі да маштабных манументальных помнікаў на радзіме і за мяжой.

Уладзімір Слабодчыкаў падбірае неабходную пластычную мову, каб паказаць шматграннасць і глыбіню аб'екта. Многія яго героі — жанчыны — моцныя, упэўненыя, нават ваяўнічыя. У экспазіцыі выстаўкі можна ўбачыць як Афрадыту з грэчаскай міфалогіі, так і вобраз, што нагадвае Стэфанію Станюту.

— Жаночыя вобразы і жаночая фігура ў творчасці Уладзіміра Іванавіча раскрыты неверагодна шырока, — расказвае **куратар выстаўкі вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Вольга АРХІПАВА.** — Мы не бачым у іх анатамічных падрабязнасцяў, ідэалу жаночай прыгажосці, а бачым менавіта знак, што ўвасабляе вобраз. Фігура кожнай са скульптур — гэта перш за ўсё сублімацыя ідэі, яе перанос у статычную форму.



Уладзімір Слабодчыкаў — мастак-даследчык. Здолеў распрацаваць свой пазнавальны знак у скульптуры. У яго творчасці спалучаюцца такія прыёмы, як экспрэсіўная лепка з геаметрызмам контураў і адкрытай прасторай. Матэрыялу творца надае асаблівы сэнс. Апошнім часам манументальныя бронзавыя статуі яго ўжо не так цікавяць — на першы план выйшлі алюмініевыя рэльефы. Адна з найстарэйшых работ мастака ў экспазіцыі — «Гукі», створаная ў 1980-я гады.

— У свой час мне вельмі спадабалася працаваць з алюмініем. Калі ён паліруецца, атрымліваецца эфект серабра, мельхіёру — каштоўнага матэрыялу, — расказвае Уладзімір Слабодчыкаў. — Ён дастаткова дэкаратыўны, сучасны і па колеры, і па пластыцы. Таму цяпер больш працую з гэтым матэрыялам. У нашым асяроддзі яго называюць сілумінам, таму што сплавы атрымліваюцца неаднародныя, гэта не чысты алюміній.

Часта ў кампазіцыях майстар выкарыстоўвае структуры рашоткі, якія пачынаючы з ХХ стагоддзя сталі сімвалам авангардных эксперыментаў у мастацтве. У работах Уладзіміра Слабодчыкава яны набываюць новае прачытанне: замест жорсткіх абмежаваных структур становяцца паветранымі і лёгкімі, перадаюць імкненне, стан палёту. Сам мастак называе такі стан алегорыяй ваганняў паміж матэрыяльным і духоўным.

Бывае, майстар працуе на заказ, але выбірае: яму цікава не столькі задавольваць заказчыка, колькі зрабіць так, каб у творы жыла душа.

**Апошнім часам манументальныя бронзавыя статуі яго ўжо не так цікавяць — на першы план выйшлі алюмініевыя рэльефы.**

Усё сваё жыццё аўтар вагаецца паміж выкладчыцкай дзейнасцю і мастацтвам. Адзначае, што яму заўсёды складана сумяшчаць гэтыя два кірункі. Былі моманты, калі хацеў усё кінуць і займацца толькі скульптурай, аднак гэтага не дазволіла адказнасць за вучняў. Студэнты Уладзіміра Слабодчыкава часта запрашаюць настаўніка на сустрэчы і з цеплынёй успамінаюць моманты вучобы. Ён кажа, што такія размовы дапамагаюць быць маладзейшым і больш актуальным.

Усё ж такі галоўны лейтматыў творчасці майстра — чалавек: няма нічога больш каштоўнага за дабрыню, якая жыве ў душы людзей, і цеплыню, якая можа саграваць нават на адлегласці, — упэўніца ў гэтым можна да 25 сакавіка ў Нацыянальным мастацкім музеі.

**Вікторыя АСКЕРА** ■

# КОЛАСАВА РАЛЛЯ

## Яе дбайна засяваюць нашчадкі народнага паэта

**Летась грамадскасць краіны шырока адзначыла 135-годдзе з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа. Нягледзячы на тое, што прайшло шмат розных мерапрыемстваў, прысвечаных Якубу Коласу, тэму нельга лічыць вычарпанай. Штодзённую працу па захаванні спадчыны вялікага пісьменніка вядуць члены яго сям'і: запісваюць і захоўваюць успаміны, даследуюць архівы, рыхтуюць выстаўкі, даклады і артыкулы, удзельнічаюць у сустрэчах у краіне і за мяжой. Як захоўваецца спадчына класіка ў яго сям'і, у памяці новых пакаленняў, мы распыталі ў яго сына Міхаіла Канстанцінавіча Міцкевіча і ўнучкі, Марыі Міхайлаўны.**

### Міхаіл Міцкевіч: «Я — «віноўнік» напісання трох паэм»

92-гадовы Міхаіл Канстанцінавіч, нягледзячы на паважны ўзрост, мае надзвычайную памяць — падзеі і даты з уласнага і бацькавага жыцця памятае яскрава, пра што і расказвае з бліскучым пачуццём гумару. Вядомы навуковец, ён 55 гадоў адпрацаваў у фізіка-тэхнічным інстытуце Акадэміі навук, распрацаваў навуковыя асновы тэхналогіі вырабу такіх складаных дэталяў, як штампы, пасля — арыгінальную тэхналогію вырабу фасоннага дрэваапрацоўчага інструменту і іншыя.

— У 1949 годзе я скончыў політэхнічны інстытут і мяне накіравалі ў фізіка-тэхнічны інстытут Акадэміі навук. А там толькі сталы, крэслы, выпрамнік і некалькі вымяральных прыбораў. Ні станкоў, ні якога іншага абсталявання, — успамінае Міхаіл Канстанцінавіч. — Акадэміі было забаронена набываць станкі, а як без іх тэхналогію распрацоўваць? У такіх умовах мы і пачыналі сваю працу. Тым не менш на заводзе БАТЭ выпусцілі больш за 70 станкоў, якія мы распрацавалі разам з канструктарамі прадпрыемства. Пяць гадоў я быў сакратаром камісіі па абароне доктарскіх дысертацый. Восем гадоў адпрацаваў у экспертным савеце Вышэйшай атэстацыйнай камісіі. Праз мае рукі прайшло шмат работ. Некалі ў юнацтве здзівіў бацькаў водгук. Я яму сказаў, што прачытаў цікавую кнігу Дзюма, а ён кажа: «Сынок, гэта пустая літаратура, там няма нічога для душы!». Калі ён быў у складзе камітэта па сталінскіх прэміях, яму дасылалі вялікі стос твораў, яназіраў, як ён прагартае ўсё, штосьці прачытае цалкам, а на іншую рэч скажа: гэта фальш, чытаць не буду. Я здзіўляўся, па якіх прыкметах ён ацэньвае такія работы. А яму дапамагаў велізарны вопыт! І вось калі я сам сотні рэфератаў перачытаў, ужо было проста вызначыць, што каштоўнае, а што — не. Прыходзілася рабіць заўвагі і па два-тры разы адпраўляць дысертантаў дапрацоўваць высновы. Затое пасля гэтага дысертацыя была як цукерачка.

***— На заслужаным адпачынку вы ажыццявілі шэраг праектаў па захаванні спадчыны бацькі, у прыватнасці надрукавалі некалькі кніг...***

— Так, калі пакінуў Акадэмію навук, мяне запрасілі на працу ў музей Якуба Коласа. Я зрабіў больш за сотню выступленняў у школах, гімназіях, універсітэтах, ваенных часцях, часта браў з сабой паэта і літаратуразнаўцу, аўтара выдатнай кніжкі «Запрашэнне ў музей» Івана Курбеку. Сваю кнігу «Пад бацькоўскім дахам» я выпусціў крыху раней. І ўключыў у яе ліст аб стане беларускай мовы, які Колас пісаў у ЦК партыі. Да гэтага ён толькі аднойчы быў надрукаваны ў «ЛіМе» — у 60-х гадах. Пазней я сустрэў Генадзя Бураўкіна. Ён кнігу пахваліў, а з-за таго, што я апублікаваў гэты ліст, стварыў цудоўную паэму «Развітанне». Пасля я напісаў успаміны пра свайго брата Юрку пад назвай «Слова пра Юрку, Коласава сына». Друкаваліся яны ў часопісе «Полымя», калі яго рэдагаваў Мікола Мятліцкі. Яму так спадабаліся ўспаміны, што ён з гэтай нагоды напісаў паэму «Апалены золак», мы разам выпусцілі гэту кнігу. Вось так я стаў «віноўнікам» трох паэм: «Міхасёвы прыгоды», якую напісаў бацька, а таксама «Развітанне» Генадзя Бураўкіна і «Апалены золак» Міколы Мятліцкага.

Пасля я падрыхтаваў кнігу «Якуб Колас. У думках, у сэрцах, у песнях», дзе сабраў і змясціў успаміны, якія змог знайсці. Там, дарэчы, шмат маіх фотаздымкаў: фатаграфія — адно з маіх вялікіх захапленняў.

У 20-томным зборы твораў Якуба Коласа ёсць і паэма «На шляхах волі». Раней яна ні разу не выходзіла асобна. Гэта вельмі цікавая паэма памерам з «Новую зямлю». Колас пісаў яе на працягу ўсяго жыцця з вялікімі перапынкамі і хацеў скончыць яшчэ трыма раздзеламі. Аднак фактычна яна скончаная. І гучыць як магутны антываенны твор. Яе можна разглядаць як раман: там і гісторыя кахання, і вялікі ахоп герояў. І я ажыццявіў сваю задуму: у выдавецтве «Мастацкая літаратура» паэма «На шляхах волі» надрукаваная асобна. Спадзяюся, што будзе выдадзена кніга «Сымон-музыка», гэта мая даўняя мара, у наступнай рэдакцыі: чатыры раздзелы з трэцяга варыянта, больш распрацаванага, чым папярэдні. А фінал — з першага. Для тэатральнай пастаноўкі гэта цуд! У фінале там фантастычная сцэна на могілках! Таксама мяркуецца ўключыць тыя фрагменты, выкінутыя пад ціскам цэнзуры. Дарэчы, неяк да нас прыязджалі пісьменнікі з Санкт-Пецярбурга, мы падарылі «Сымона-музыку», яны вельмі зацікавіліся і пераклалі паэму на рускую мову.

Акрамя гэтага, я рэкамендаваў Віктару Шніпу (галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». — **Аўт.**) выдаць кнігу Адама Міцкевіча і Канстанціна Міцкевіча «Пан Тадэуш» і «Новая зямля» ў адным томе. У Адама Міцкевіча размова ідзе таксама пра Беларусь, пра тую ж зямлю, толькі на паўтара стагоддзя раней, чым у «Новай зямлі». Гэта вельмі каштоўнае спалучэнне для таго, каб уявляць, што было ў Беларусі. Тым больш што паэмы пераклікаюцца па многіх пытаннях... Вось тое асноўнае ў літаратурным плане, што мне ўдалося здзейсніць. Напэўна, можна было зрабіць трошкі больш. Але ў мяне было шмат і сваіх захапленняў: акрамя фатаграфіі, я заўзяты паляўнічы, рыбак, грыбнік.

***— Міхаіл Канстанцінавіч, акрамя маштабнай літаратурнай працы, вы займаліся і захаваннем памяці бацькі ў музеі Якуба Коласа, перадалі шмат яго ўласных фотаздымкаў і рэчаў...***




— Так, перадаў не толькі ўласныя, але і тыя фотаздымкі, што знайшоў у сваякоў, іншых людзей, яны зроблены ў 20—30-я гады мінулага стагоддзя. У Мар'інай Горцы, напрыклад, Аляксандр Пранговіч неяк вырашыў зрабіць пры мастацкім музеі, дзе сабраныя карціны пухавічан, экспазіцыю «Колас на Пухавіччыне». Я аддаў туды шмат фотаздымкаў, рэчаў Коласа. А мастакі аформілі малюнкамі. Атрымаўся вельмі прыгожы пакойчык. Напісаў і тэкст экскурсаводу. Усім раю бы пры зручным выпадку наведаць гэты музей.



### Марыя Міцкевіч: ад Якуба Коласа да Янкі Маўра

Працягвае справу бацькі па захаванні спадчыны дзеда і старэйшая ўнучка Якуба Коласа Марыя Міхайлаўна Міцкевіч. Яна шмат гадоў працавала выкладчыкам вышэйшай матэматыкі, а на заслужаным адпачынку вядзе даследчую работу па творчасці Якуба Коласа, а таксама свайго другога дзядулі, пісьменніка Янкі Маўра.

— Амаль штогод я бяру ўдзел у канферэнцыях «Каласавіны». Калі рыхтую даклад, стараюся знайсці нешта новае, невядомыя раней цікавыя факты пра Коласа. Напрыклад, пару гадоў таму ў Латвіі мне ўдалося знайсці невядомы аўтограф Коласа ў музеі Андрэя Упіта. Калісьці Колас павіншаваў яго з юбілеем, падарыў кніжку і пакінуў у ёй аўтограф. І калі іншыя былі надрукаваныя, а гэты дасюль заставаўся невядомым. Такое маленькае адкрыццё. Увогуле даводзіцца часам бываць у Латвіі, неаднойчы я выступала ў знакамітай Рыжскай беларускай асноўнай школе імя Янкі Купалы. Зусім нядаўна дырэктарку гімназіі прымалі ў Мінску. Я некалькі разоў выступала перад школьнікамі з лекцыямі як па творчасці Якуба Коласа, так і Янкі Маўра. Бо Маўр нарадзіўся ў Латвіі, і мне самой было цікава наладзіць такую сувязь з беларусамі, што жывуць там, а таксама з культурна-асветніцкімі ўстановамі. Я правяла вялікую працу, падабрала шмат цікавых дакументаў і склала выстаўку «Колас і Маўр: па жыцці разам». Спачатку яна экспанавалася ў акадэмічнай бібліятэцы латвійскага ўніверсітэта, потым — у Рыжскай беларускай асноўнай школе. І па дамоўленасці з амбасадай я вырашыла гэту выстаўку падарыць школе.

Аднойчы мне патэлефанавалі са згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» і расказалі пра жанчыну з Грузіі, у якой захавалася кніга з аўтографам Коласа. Мы сустрэліся, высветлілася, што яе дзед вучыўся разам з Коласам у настаўніцкай семінарыі. Яна, дарэчы, падарыла гэтую кнігу музею. Васіліна, мая дачка, напісала артыкул пра гэтую сям'ю, нашу сустрэчу, кнігу і знойдзены аўтограф.

Паколькі я цесна сябрую з беларускай эміграцыяй, некалькі гадоў працую над тэмай даследавання «Колас у эміграцыйным друку». Збіраю тыя матэрыялы, якія друкаваліся пра Коласа, каб з'явілася ўяўленне, якім ён быў для тых, хто пакінуў бацькаўшчыну, але сэрцам застаўся беларусам. У музеі Якуба Коласа ўжо праводзілася выстаўка «Колас у эміграцыйным друку», якую я падрыхтавала, дзе было шмат цікавых матэрыялаў з газет, часопісаў, што выходзілі за межамі Беларусі. Працягваю збіраць іх і дагэтуль.

***— Частка вашых даследаванняў прысвечана брату Якуба Коласа Міхасю Міцкевічу...***

— Летась споўнілася 120 гадоў з дня яго нараджэння. Гэта малодшы брат, які пасля выехаў у эміграцыю, жыў у ЗША. Пра яго я напісала некалькі артыкулаў, зрабіла выстаўку. Асоба Міхася Міцкевіча цікавая тым, што Колас з дзяцінства яго выхоўваў. У Якуба Коласа было чатыры браты, чатыры сястры, але толькі Міхась скончыў настаўніцкую семінарыю, спрабаваў свае сілы ў літаратурнай творчасці, ён вядомы пад псеўданімам Антось Галіна. Калі памёр бацька, Якуб Колас працаваў у Пінкавічах на Палессі. І забраў да сябе двух малодшых братоў, Юзіка і Міхася, каб маці было лягчэй. Сам іх вучыў, выхоўваў.

***— У коле вашых даследчых інтарэсаў і другі ваш дзядуля, пісьменнік Янка Маўр...***

— Сапраўды, зараз актыўна гэтым займаюся. Хутка будзе 135 гадоў з дня яго нараджэння. Я была ўкладальнікам кнігі «Янка Маўр», якая выйшла ў 2016 годзе ў "Беларускім кнігазборы». А прадмову да яе напісала мая дачка Васіліна. Першую кнігу ўспамінаў пра Янку Маўра я аддала ў выдавецтва «Мастацкая літаратура», яна хутка ўбачыць свет. Працуючы ў архівах, знайшла шмат неапублікаваных матэрыялаў. Таму рыхтую другую кнігу, якая будзе называцца «Нядзіцячы Маўр». Яго ўсе ведаюць як дзіцячага пісьменніка, але ж ён працаваў у «ЛіМе», яго публіцыстыка друкавалася ў «Вожыку». У архіве я знайшла неапублікаваны раман «Дзяўчына-маці» пра мінскае гета. Гісторыя пра дзяўчыну, якая выратавала дзіця з гета і расціла, як сваё. У часопісе «Полымя» да 135-годдзя Янкі Маўра выйдзе гэты раман. Ёсць і казкі, артыкулы пра літаратуру, літаратурную крытыку, пра дзіцячую літаратуру — усё гэта ўвойдзе ў кнігу «Недзіцячы Маўр».

***— У выдавецкім доме «Звязда» выходзіла кніга ўспамінаў «Доўгая дарога ад дома Янкі Маўра да дома Якуба Коласа»...***

— Гэта ўспаміны маёй мамы Наталлі Іванаўны. Яна ўжо цяжка хварэла, калі напісала гэту кнігу. Калі пра Якуба Коласа нямала ўспамінаў, то пра Янку Маўра іх амаль не было. Гэтым і каштоўная маміна праца. Я, дарэчы, летась падала яе на конкурс non-fiction літаратуры, і яна ўвайшла ў шасцёрку найлепшых.

***— Якія ў вас найбліжэйшыя планы?***

— Пазалетась рабіла даклад у бібліятэцы Францыска Скарыны ў Лондане і там адсканавала рукапісы Коласа, яго аўтографы, і вось у мяне ёсць задума выдаць альбом гэтых рукапісаў. Дарэчы, менавіта там захоўваецца і верш «Антону Луцкевічу», які доўга не друкаваўся. Таксама збіраюся выдаць кнігу твораў малодшага брата Якуба Коласа, Міхася Міцкевіча.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
13.03.2018 г.
Лихачевский В. В.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## ОБ ЭМИССИИ ОБЛИГАЦИЙ ВТОРОГО ВЫПУСКА
## Открытого акционерного общества «Обувь»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:

На русском языке:

полное — Открытое акционерное общество «Обувь» (далее – Эмитент);

сокращенное — ОАО «Обувь».

На белорусском языке:

полное — Адкрытае акцыянернае таварыства «Абутак»;

сокращенное — ААТ «Абутак».

2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail), официальный сайт: Республика Беларусь, 212026, г. Могилев, ул. Якубовского, д. 20; тел. 8 0222 27 96 03, e-mail: shagovita@shagovita.by, официальный сайт: www.shagovita.by (далее – сайт Эмитента).

Эмитент зарегистрирован Могилевским областным исполнительным комитетом 12.06.2000 (решение № 13-7) в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 700181573.

3. Основными видами экономической деятельности Эмитента являются:

производство обуви,

неспециализированная оптовая торговля непродовольственными товарами;

розничная торговля обувью.

4. Уставный фонд Эмитента составляет 9 836,80 (девять тысяч восемьсот тридцать шесть белорусских рублей, 80 копеек).

5. Денежные средства, поступающие при размещении облигаций Эмитента второго выпуска, будут зачисляться в соответствии с законодательством Республики Беларусь в безналичном порядке на расчетный счет Эмитента в иностранной валюте **BY53BELB30121115480280226000** в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X.

В случае использования белорусских рублей для расчетов по Облигациям второго выпуска при их размещении, обращении и погашении, денежные средства в соответствии с законодательством Республики Беларусь и правилами ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в безналичном порядке будут зачисляться на счет Эмитента в белорусских рублях **BY55BELB30121115480020226000** в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X.

6. Депозитарием Эмитента является Общество с ограниченной ответственностью «Промреестр» (далее – депозитарий), зарегистрированный Минским горисполкомом 29.06.2001 за № 101275094, код депозитария – D23.

Место нахождения депозитария: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, д.16, к. 608, телефон 8017 2000272.

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-124-1123, выдано Министерством финансов Республики Беларусь.

7. Решение о втором выпуске облигаций Эмитента принято наблюдательным советом Эмитента 30.11.2017 (Протокол № б/н).

8. Облигации второго выпуска – именные, процентные, конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равные объем и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска облигаций независимо от времени приобретения (далее в настоящем документе совокупно именуемые «Облигации»).

Объем выпуска Облигаций – 880 000 (восемьсот восемьдесят тысяч) долларов США.

Количество Облигаций – 8 800 (восемь тысяч восемьсот) штук.

Номинальная стоимость Облигации – 100 (сто) долларов США.

9. В соответствии с Инструкцией о некоторых вопросах выпуска и государственной регистрации ценных бумаг, утвержденной постановлением Министерства финансов Республики Беларусь от 31.08.2016 № 78, Эмитент эмитирует Облигации в размере не более 80 процентов стоимости обременяемого залогом имущества.

В качестве обеспечения исполнения обязательств Эмитента по облигациям выступают объекты недвижимости, принадлежащие Эмитенту на праве собственности:

нежилое изолированное помещение с инвентарным номером № 700/D-87478 (назначение: помещение неустановленного назначения), расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Якубовского, 20, площадью 1129,6 кв. м, рыночная стоимость которого на дату оценки (28 ноября 2017 года) (без учета НДС) составляет 329 825,09 (триста двадцать девять тысяч восемьсот двадцать пять долларов США, 9 центов).

Стоимость подтверждена заключением об оценке рыночной стоимости от 04.12.2017, № 372-17/ОЦ-2;

– нежилое изолированное помещение с инвентарным номером № 700/D-87479, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Якубовского, д. 20, площадью 1270,3 кв. м, (назначение: помещение неустановленного назначения) рыночная стоимость которого на дату оценки (28 ноября 2017 года) (без учета НДС) составляет 365 007,77 (триста шестьдесят пять тысяч семь долларов США, 77 центов).

Стоимость подтверждена заключением об оценке рыночной стоимости от 04.12.2017, № 372-17/ОЦ-2;

– изолированное нежилое помещение № 3 с инвентарным номером № 700/D-84534 (назначение: помещение неустановленного назначения), расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Якубовского, 20-3, площадью 647,8 кв. м, рыночная стоимость которого на дату оценки (28 ноября 2017 года) (без учета НДС) составляет 208 489,95 (двести восемь тысяч четыреста восемьдесят девять долларов США, 95 центов).

Стоимость подтверждена заключением об оценке рыночной стоимости от 04.12.2017, № 372-17/ОЦ-2;

– изолированное производственное помещение с инвентарным номером № 700/D-81795 (назначение: производственное помещение), расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Якубовского, 20, площадью 904 кв. м, рыночная стоимость которого на дату оценки (28 ноября 2017 года) (без учета НДС) составляет 216 358,44 (двести шестнадцать тысяч триста пятьдесят восемь долларов США, 44 цента).

Стоимость подтверждена заключением об оценке рыночной стоимости от 04.12.2017, № 372-17/ОЦ-2.

Права залогодателя на имущество, выступающее в качестве предмета залога по Облигациям, свободны от любых обременений (ограничений).

Независимая оценка вышеуказанного недвижимого имущества проведена Обществом с ограниченной ответственностью «Инновационный консалтинг».

Оценка выполнена доходным (метод дисконтирования денежных потоков), сравнительным (метод последовательного внесения корректировок), метод с учетом СТБ 52.0.01-2017, СТБ 52.2.01-2017, СТБ 52.3.01-2017 и ТКП 52.3.01-2015.

Сведения об Исполнителе оценки: ООО «Инновационный консалтинг», 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Скрыганова, 6А, пом. № 14, комн. 32.

Сайт: www.inkons.by

Сведения об оценщике:

Булыга Павел Валерьевич, свидетельство об аттестации оценщика № 30597 на право проведения оценки капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, не завершенных строительством объектов и имущественных прав на них от 23.06.2014. Продлено на основании приказа Госкомимущества № 112 от 16.06.2017. Срок действия до 23.06.2020.

Оставшаяся часть указанного выше недвижимого имущества может быть использована в качестве последующего залога по облигациям Эмитента последующих выпусков.

10. Размещение Облигаций осуществляется после регистрации Проспекта эмиссии Облигаций, заверения Краткой информации об эмиссии Облигаций и ее раскрытия на Едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг, а также путем опубликования в газете «Звязда», размещения на официальном сайте Эмитента в глобальной компьютерной сети интернет, а также на официальном сайте организатора торговли – ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в глобальной компьютерной сети интернет.

Дата начала размещения Облигаций – 15 января 2018 года. Дата окончания размещения Облигаций – 15 декабря 2019 года. Иная дата окончания периода размещения Облигаций может быть определена решением Наблюдательного совета Эмитента, принятым в порядке и в сроки, определенными законодательством Республики Беларусь о ценных бумагах.

Срок размещения Облигаций может быть сокращен в случае полной реализации всего объема выпуска Облигаций.

11. Открытая продажа Облигаций осуществляется на организованном рынке в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа) в соответствии с законодательством Республики Беларусь и локальными нормативно-правовыми актами Биржи.

Время проведения Открытой продажи Облигаций – в соответствии с регламентом торгов Биржи. Расчеты при размещении Облигаций на организованном рынке производятся в соответствии с регламентом расчетов Биржи.

12. Срок обращения Облигаций – 730 календарных дней (с 15.01.2018 г. по 15.01.2020 г.).

13. Дата начала погашения Облигаций – 15.01.2020 г.

Для целей погашения Облигаций депозитарий Эмитента формирует реестр владельцев Облигаций по состоянию на 10.01.2020 г.

В случае если дата формирования реестра владельцев Облигаций для целей погашения облигаций выпадает на нерабочий день, формирование реестра владельцев Облигаций осуществляется в последний рабочий день, предшествующий нерабочему дню.

14 По Облигациям установлен постоянный процентный доход (далее – доход), выплачиваемый периодически в течение срока обращения Облигаций по ставке 7 (семь) процентов годовых.

Выплата дохода владельцам Облигаций производится:

в даты выплаты дохода;

на основании реестра владельцев Облигаций, сформированного Депозитарием для целей выплаты дохода;

путем перечисления Эмитентом в безналичном порядке суммы дохода на счета Владельцев Облигаций, открытые в банках Республики Беларусь в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь. В случае выплаты суммы дохода по Облигациям в белорусских рублях выплата осуществляется по официальному курсу Национального Банка Республики Беларусь, установленному на дату выплаты процентного дохода по Облигациям. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации по правилам математического округления с точностью до целой белорусской копейки.

Выплата суммы дохода по Облигациям может быть организована через Депозитарий Эмитента в соответствии с договором на депозитарное обслуживание Эмитента.

В случае отсутствия в реестре владельцев Облигаций данных о счетах Владельцев Облигаций а также в случае, если реестр владельцев Облигаций содержит ошибочные банковские реквизиты, подлежащая выплате сумма резервируется на счете Эмитента, выплачивается после письменного обращения владельца Облигаций к Эмитенту.

15. В период обращения Облигаций Эмитент вправе по собственной инициативе принять решение о досрочном погашении данного выпуска Облигаций либо его части до даты начала их погашения.

Кроме того, Эмитент осуществляет досрочное погашение Облигаций настоящего выпуска (части выпуска Облигаций) в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь при невозможности замены обеспечения.

В случае принятия решения о досрочном погашении части данного выпуска Облигаций досрочное погашение осуществляется каждому владельцу Облигаций пропорционально количеству принадлежащих ему Облигаций. Расчет количества досрочно погашаемых Облигаций осуществляется с округлением до целого числа согласно правилам математического округления.

Досрочное погашение осуществляется Эмитентом:

в отношении лиц, указанных в реестре владельцев Облигаций, который формируется депозитарием Эмитента за 3 (три) рабочих дня до установленной даты досрочного погашения Облигаций;

путем перечисления в безналичном порядке причитающихся на дату досрочного погашения денежных средств в валюте номинала Облигаций на счета владельцев Облигаций в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь. В случае досрочного погашения Облигаций в белорусских рублях досрочное погашение осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату досрочного погашения Облигаций. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации, с учетом правил математического округления, с точностью до целой белорусской копейки.

Выплата денежных средств при досрочном погашении Облигаций может быть организована через Депозитарий Эмитента в соответствии с договором на депозитарное обслуживание Эмитента.

16. При погашении Облигаций владельцам Облигаций выплачивается номинальная стоимость Облигаций, а также доход за последний период начисления дохода (иной неполученный доход – при наличии).

Погашение Облигаций осуществляется Эмитентом:

в отношении лиц, указанных в реестре владельцев Облигаций, сформированном депозитарием Эмитента на дату, указанную в абзаце втором пункта 13 настоящего документа;

путем перечисления Эмитентом в безналичном порядке причитающейся суммы денежных средств в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь на счета владельцев Облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. В случае выплаты денежных средств, причитающихся при погашении, в белорусских рублях выплата осуществляется по официальному курсу Национального Банка Республики Беларусь, установленному на дату начала погашения Облигаций. Округление полученных значений осуществляется по каждой Облигации по правилам математического округления с точностью до целой белорусской копейки.

17. В период обращения облигаций Эмитент обязуется осуществлять приобретение Облигаций до даты начала их погашения с возможностью их последующего обращения (далее – досрочный выкуп Облигаций) по номинальной стоимости Облигаций в следующую дату: 15.01.2019 г., у любого их владельца. Если установленная дата выкупа выпадает на нерабочий день, выкуп облигаций Эмитентом осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по текущей стоимости облигаций. Досрочный выкуп Облигаций осуществляется на организованном рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь и правилами, определяемыми Биржей.

18. В случае запрещения эмиссии Облигаций, признания республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг, выпуска Облигаций недействительным Эмитент:

возвращает владельцам Облигаций средства, полученные в оплату Облигаций, а также накопленный по этим Облигациям доход в месячный срок с даты признания выпуска Облигаций недействительным, запрещения эмиссии Облигаций. При этом все Облигации второго выпуска подлежат изъятию из обращения;

письменно уведомляет Регистрирующий орган о возврате указанных средств владельцам Облигаций в полном объеме.

19. Выпуск Облигаций зарегистрирован Республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг, 18 марта 2018 года.

Государственный регистрационный номер второго выпуска Облигаций 7-401-02-3294.

20. Ознакомиться с Проспектом эмиссии (изменениями в Проспект эмиссии – при наличии) можно визуально по адресу нахождения Эмитента: Республика Беларусь, 212026, г. Могилев, ул. Якубовского, д. 20 с 10.00 до 16.00 в будние дни, на сайте Эмитента либо на сайте Организатора выпуска ООО «Ласерта» www.lacerta.by.

Первый заместитель
Генерального директора ОАО «Обувь» Ольшаников П. М.

Главный бухгалтер ОАО «Обувь» Абушкевич М. И.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | – Капитальное строение, инв. № 441/С-13231 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание хлебозавода), площадью 3013,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8;<br>– капитальное строение, инв. № 441/С-14071 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание трансформаторной подстанции), площадью 37,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8;<br>– капитальное строение, инв. № 441/С-14070 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание гаража), площадью 201,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8;<br>– капитальное строение, инв. № 441/С-14073 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада), площадью 236,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8;<br>– капитальное строение, инв. № 441/С-14072 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание проходной), площадью 15,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8;<br>– капитальное строение, инв. № 441/С-14062 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – благоустройство), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8.<br>– капитальное строение, инв. № 441/С-14061 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводная сеть), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8;<br>– капитальное строение, инв. № 441/С-14060 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – линия электропередачи), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8;<br>– капитальное строение, инв. № 441/С-14064 (назначение – сооружение специализированное трубопроводного транспорта, наименование – газопровод), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8;<br>– капитальное строение, инв. № 441/С-14063 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Чапаева, 8 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 422950100001002276, (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений), площадью 1,1980 га, расположенном по адресу: г. Ивье |
| Начальная цена продажи | 119 020,80 руб. (сто девятнадцать тысяч двадцать рублей восемьдесят копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 5 951 руб. (пять тысяч девятьсот пятьдесят один рубль) |
| Продавец | Ивьевский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231337, Гродненская область, г. Ивье, ул. Энгельса, 5, тел. 2-11-67, факс 2-23-95 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия аукциона | Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя.<br>Право собственности переходит к Покупателю после передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».<br>Документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.<br>Расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, и публикации извещения в средствах массовой информации и размещения на официальном сайте, возмещаются Победителем аукциона Ивьевскому филиалу Гродненского областного потребительского общества |
| Условия оплаты | Покупателю предоставляется право рассрочки платежа сроком на 1 год, с уплатой первоначального взноса в день подписания договора купли-продажи в размере 20 % от стоимости |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 4 апреля 2018 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:**
**г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30**
**(понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**
**Последний день приема заявлений – 29 марта 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-3, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*
*Дополнительная информация http://grodnoino.by/*

■ Мінскія хронікі

# ВАС ТУТ НЕ СТАЯЛА

## ЯКІЯ НОВЫЯ ПОМНІКІ З'ЯЎЛЯЮЦЦА Ў МІНСКУ?

**Звычайна помнікі ўспрымаюцца як неад'емная частка горада, здаецца, што яны былі заўсёды і застануцца на сваіх месцах таксама навечна. Такі настрой дыктуе сама іх назва. Тым не менш на карце беларускай сталіцы перыядычна з'яўляюцца новыя маўклівыя сведкі часу. Прычым нярэдка — гэта прывітанне праз флёр стагоддзяў. Такое жыццё: часта, каб ацаніць чыйсьці ўклад у развіццё цэлага народа, прычым як станоўчы, так і негатыўны, павінна змяніцца не адно пакаленне...**

### «Ідылія ў рэстаране»

Помнік, пра які пойдзе гаворка, «прапісаўся» ў Мінску менш за два гады таму, тым не менш без хоць бы збеглай яго згадкі не абыходзіцца ўжо ні адна экскурсія па цэнтры. Турысты жартуюць, што яго другой назвай можа стаць «У рэстаране». Нібыта паміж двума мужчынамі адбываецца такі дыялог: «Гэта рахунак?» — «Я гэта не еў!» Не варта ўспрымаць падобныя заўвагі як абразу, бальшасць гарадскіх аб'ектаў вядуць «двайное» жыццё: афіцыйнае і тое, якое складаецца з чутак і легендаў. Вы ўжо здагадаліся, што за помнік маецца на ўвазе? Яшчэ адна падказка — ён быў адкрыты ў Дзень горада ў 2016 годзе. У Верхнім горадзе. Хаваць праўду больш не мае сэнсу — гэта помнік Станіславу Манюшку і Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу, а заадно і створаней імі сумесна оперы «Сялянка». Між іншым, першай беларускай оперы. Але ў той час гэта не толькі не праславіла аўтараў, але наклікала на іх пэўныя праблемы.



Месца для помніка, дарэчы, выбрана было невыпадкова. Усяго за сотню метраў ад яго некаторы час жыла сям'я Манюшкі. Сам Станіслаў нарадзіўся ў маёнтку Убель пад Мінскам. Ён быў адзіным дзіцем у бацькоў, слабым і хваравітым, але ў той жа час вытанчаным і захопленым мастацтвам. Адбівалася добрае паходжанне: ягоны дзед па матчынай лініі быў заснавальнікам вытворчасці слуцкіх паясоў. Бацькі бачылі ў сыне будучага прафесійнага музыку, таму адправілі яго вучыцца ў Варшаву. Аднак паўстанне 1830—1831 гадоў унесла карэктывы ў іх планы: сродкаў, каб аплачваць дарагую вучобу, не хапала, а сама сям'я вымушана была пераехаць у Мінск. Пасяліліся яны ў доме на рагу цяперашніх вуліц Энгельса і Інтэрнацыянальнай, дзе зараз знаходзіцца французская пякарня.

Станіслаў вучыўся ў гімназіі, якая размяшчалася ў будынку былога базыльянскага кляштара. Ён вельмі любіў музыку ў прынцыпе, але яго сапраўдным захапленнем быў арган. Балазе, паслухаць арганную музыку можна было зноў жа за некалькі крокаў ад дома — у Дамініканскім манастыры, які знаходзіўся на цяперашняй Кастрычніцкай плошчы. Арган славіўся на ўвесь горад, і малады чалавек быў настолькі пакораны яго чароўнымі гукамі, што вырашыў сам стаць арганістам. У канцы 1850-х, доўгі час пажыўшы ў Вільні і Пецярбургу, ён усё ж такі пераязджае ў Варшаву, дзе працуе прафесарам музыкі. Ён быў вельмі любімы ўсімі, пачынаючы ад гледачоў на канцэртах і заканчваючы сваімі студэнтамі. Як любы творчы чалавек, ён меў тонкую душэўную арганізацыю. У рэшце рэшт ён пасварыўся з дырэктарам акадэміі да такой ступені, што памёр ад разрыву сэрца. Ці так гэта было на самай справе, сцвярджаць сёння складана, але на заметку ўзяць варта: сябе трэба берагчы. Вяртаючыся да тэмы: калі кампазітара хавалі, развітацца з майстрам прыйшло 100 тысяч чалавек. Пасля сябе ён пакінуў вялікія даўгі, але і вялікую спадчыну — уся беларуская і польская опера пачалася з яго.

Што датычыцца Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, то гэта першы драматург, які пісаў на беларускай мове, пра беларусаў і для іх. У оперы «Сялянка» (або «Ідылія») галоўнымі дзейнымі асобамі былі сяляне. Не дзіўна, што ўжо на наступны дзень пасля прэм'еры царскі ўрад гэтую пастаноўку забараніў. 1852 год — час зусім не спакойны. Затое цяпер і ставіць оперу, і казаць пра яе, і нават прысвячаць ёй помнікі можна смела. О справядлівы трыумф часу!



### Гарадская мелодыя: свіст гарадавога

Наступны помнік, пра які пойдзе гаворка, не прысвечаны канкрэтнай гістарычнай асобе. Гэта сімвал прафесіі і самога адчування абароненасці. Дарэчы, ён з'явіўся ў горадзе яшчэ пазней — у мінулым сакавіку. А вось размешчаны помнік у адной з самых старых частак горада — на Гарадскім Вале. Між іншым, вуліцу ўпрыгожване нямала будынкаў, якія праектавалі ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Для Мінска з яго складанай гісторыяй захаваць іх — ужо вялікая ўдача. Сярод іх, напрыклад, пажарная часць, чый фасад з чырвонай цэглы стаў негалосны візітнай карткай Мінска, а яшчэ будынкі МУС і Музея міліцыі. Вось мы і дайшлі да сутнасці: сам помнік таксама звязаны з працай праваахоўных органаў. Яго адкрылі летась напярэдадні святкавання 100-гадовага юбілею беларускай міліцыі. Скульптура адлюстроўвае гарадавога разам з сабачкам — сімвал спакою і парадку, якія пануюць у горадзе.

Самі гарадавыя з'явіліся ў царскай Расіі, а адпаведна і ў Беларусі, якая ўваходзіла тады ў яе склад, у 1860-я гады. Функцыі, якія яны выконвалі, можна параўнаць з абавязкамі патрульна-паставой службы. Праўда, вуліцы яны не патрулявалі, а знаходзіліся ў межах строга адведзенага месца. Гэта лёгка растлумачыць: у часы адсутнасці рацый і мабільных тэлефонаў (пагадзіцеся, зараз такое ўжо досыць складана ўявіць) гарадавыя павінны былі знаходзіцца ў межах бачнасці адзін аднаго, каб у выпадку неабходнасці прыйсці на дапамогу. Цікавы факт, што на кожным пасту працавала пазменна па трое гарадавых, а вось адзін начальнік прыходзіўся чамусьці на чатырох чалавек. Да канца XIX стагоддзя быў прыняты закон, што ў гарадах з насельніцтвам больш за дзве тысячы чалавек павінна прыходзіцца не больш аднаго гарадавога на кожныя 500 чалавек. Згодна з перапісам 1897 года, у Мінску пражывала 91 тысяча чалавек, а значыць, горад мог дазволіць сабе наняць каля 180 паліцэйскіх гэтага чыну.

Пазнаць гарадавога можна было не толькі па форме — яе можна падрабязна разгледзець на помніку, — але і па свістку, які быў яго абавязковым атрыбутам.

### Шматзначнае кола

Адзін з самых «свежых» помнікаў урачыста адкрылі ў Мінску ў гэтым верасні. Ён не прысвечаны ні знакамітым асобам, ні прафесіям. Яго маштабы куды шырэйшыя. На абноўленай набярэжнай Свіслачы з'явіўся найстаражытнейшы салярны сімвал, а дакладней — кола. Чаму можа быць прысвечана такая скульптура? На самай справе — чаму пажадаеце: сонечнай энергіі, руху, жыццёваму цыклу, высакароднасці і нават самому часу. Колу менавіта з васьмю спіцамі часцей за ўсё прыпісваюць значэнне адраджэння і абнаўлення. У нашым выпадку гэтая скульптурная кампазіцыя сімвалізуе згуртаванне беларусаў усяго свету. Дарэчы, месца для яе ўстаноўкі было выбрана зусім невыпадкова. Тут знаходзілася старажытнае мінскае гарадзішча, навукоўцам нават удалося знайсці кола, узрост якога склаў каля тысячы гадоў.



На дадзены момант беларуская дыяспара па ўсім свеце налічвае каля трох мільёнаў чалавек, а гэта ў паўтара раза больш за насельніцтва Мінска. Першыя перадумовы для міграцыі беларусаў склаліся яшчэ ў XV—XVI стагоддзях. Тады шляхта з беларускіх земляў ехала ў Еўропу дзеля вучобы ва ўніверсітэтах. Большасць вярталася, але некаторыя жылі там дзесяцігоддзямі або нават заставаліся назаўсёды. Успомнім таго ж Ілью Капіевіча, які доўга жыў у Амстэрдаме, або Сцяпана Аскерку, які з'ехаў у Прусію.

У часы царскай Расіі прычыны пакінуць краіну былі крыху іншымі, адна з іх — нязгода з тагачасным рэжымам. Але, зноў жа, міграцыю тады нельга было назваць масавай. Справа ў тым, што нярэдка такой магчымасцю карысталіся выдатныя асобы, таму тэма і была на слыху. Памятаеце гісторыю Тадэвуша Касцюшкі ці Івана Дамейкі?

Масавы характар міграцыя набыла ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Мінск, буйны горад, яна закранула не так моцна, як навакольныя вёскі. Людзі беглі з краіны з-за беззямелля і адсутнасці сродкаў для існавання. Цяпер бы мы назвалі гэта «амерыканскай марай», а тады гэта было проста спробай пракарміць сям'ю. Эмігравалі ў ЗША, Канаду, Бразілію, Аргенціну, краіны Заходняй Еўропы, вялікая частка беларусаў, каля 700 тысяч, адправілася асвойваць новыя землі ў Сібіры. Што было далей, усім добра вядома: войны, рэвалюцыі, рэпрэсіі — усе гэтыя падзеі прымушалі людзей пакідаць любімыя прасторы ў пошуках бяспекі.

«Ідэалогія» сучаснай моладзі актыўна накіравана на касмапалітызм. Падарожнічайце, жывіце ў іншых краінах, але памятайце, хто вы ёсць і што вы заўсёды можаце вярнуцца. Вярнуцца, каб прагуляцца па знаёмых з ранняга дзяцінства ці юнацтва ўтульных вулачках беларускай сталіцы. Можа быць, па дарозе вы прыкмеціце яшчэ некалькі новых цікавых кампазіцый...

Дар'я КАСКО

■

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

## ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# СЧАСТЛИВЫЙ ПЕРЕВОД!

ГЛАВА 1
